

НЕ ВЫПРАБОЎВАЙЦЕ ІМУНІТЭТ 3



ДЗЕВЯЦЬ ПРЫКЛАДАЎ МУЖНАСЦІ 6

20 МАЯ 2020 г.
СЕРАДА
№ 96 (29210)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «Паваротны пункт на шляху аднаўлення эканомік»



Фота БелТА.

**Ідзе шосты год жыццядзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза. І другі раз у яго органах старшынствуе Беларусь. Наша краіна задавала тон на самым пачатку, а цяпер аказалася каля руля падчас самага сапраўднага сусветнага шторму. 19 мая павінен быў адбыцца саміт ЕАЭС у Мінску. І ён адбыўся, але на тэрыторыі адразу пяці краін — у фармаце відэаканферэнцыі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў гэты саміт экстэрытарыяльным. І прапанаваў усё ж такі сустрэцца лідарам пяці дзяржаў-членаў і шостай краіны-назіральніка ў Мінску вочна. Сёлета. Увосень. Прапанова была падтрымана. А пакуль...**

**Прэзідэнты разгледзелі 10 пытанняў, і цэнтральнае сярод іх — праект Стратэгіі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года.**

### Разам адказваць на выклікі лягчэй

Прэзідэнт Беларусі, Старшыня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што 14 красавіка лідары «пяцёркі», таксама ў фармаце відэаканферэнцыі, абмеркавалі найбольш актуальныя пытанні процідзеяння каранавіруснай інфекцыі, а таксама неадкладныя меры падтрымкі эканомік краін-членаў. Вынікам той размовы стала Сумесная заява, у якой бакі выказалі гатоўнасць супрацьстаяць выклікам сучаснасці. Цяпер трэба абмеркаваць меры эканамічнага характару з улікам становішча, якое імкліва мяняецца, упэўнены кіраўнік Савета.

«Бягучая сітуацыя ў свеце і на постсавецкай прасторы знаходзіцца ў пастаяннай дынаміцы. Нягледзячы на гэта, ужо відавочна, што яе ўспрыманне ў большасці краін пачынае кардынальна мяняцца. ***Працяглыя каранціны і самаізаляцыя насельніцтва выразна паказалі, што нават у звышдзяржаў няма запасу трываласці, які дазваляе ва ўмовах закрытых граніц і непрацуючых прадпрыемстваў нейкі значны час утрымліваць ад спаду нацыянальныя эканомікі»,*** — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што эксперты робяць негатыўныя прагнозы для асобных дзяржаў і нават кантынентаў на найбліжэйшую і аддаленую перспектыву. Адной з асаблівых праблем яны называюць пытанне забеспячэння насельніцтва харчаваннем. Таму сёння Аляксандр Лукашэнка вельмі важным лічыць пошук шляхоў захавання сельскагаспадарчых і прамысловых галін нашых краін і адначасовае прыняцце ўсіх мер па абароне людзей.

«Спадзяёмся, што Расія як лакаматыў нашага інтэграцыйнага аб'яднання будзе суадносіць меры па аднаўленні эканамічнага росту з дамоўленасцямі ў рамках саюза па забеспячэнні свабоднага доступу тавараў на рынкі краін саюза», — падкрэсліў Старшыня Савета.

У гэтай сувязі праект Стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года набывае асаблівае значэнне.

«Дадзены дакумент — гэта адначасова і план дзеянняў па паглыбленні адносін, і свайго кшталту ***паваротны пункт на шляху аднаўлення і павышэння тэмпаў развіцця эканомік нашых краін. Яго падрыхтоўка ішла складана, але ў цэлым нам удалося выйсці на ўзгодненыя рашэнні па ўсіх кірунках паглыблення інтэграцыі.*** Я хацеў бы падзякаваць усім вам за канструктыўны падыход», — пракаментаваў Старшыня ВЕЭС.

СТАР. 2

Знакавая дата

## Святочны звон у Жыровіцах

**Адзін з галоўных цэнтраў беларускага праваслаўя адзначае гэтымі днямі два вялікія юбілеі — 550-годдзе з'яўлення цудатворнага абраза Божай Маці Жыровіцкай і 500-годдзе заснавання Жыровіцкага Свята-Успенскага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра. Акурат напярэдадні святочных дат у манастыр былі дастаўлены новыя званы.**





Фота Мінскай духоўнай семінарыі.

Званы адлівалі на заводзе «Вера» ў Варонежы, прычым гэтым пытаннем апекаваліся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, і намеснік манастыра — архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый, а асноўныя выдаткі ўзяў на сабе айчынны банк ВТБ. У перспектыве, кажуць у абіцелі, плануецца і ўзвядзенне новай манастырскай званіцы, а пакуль каштоўны падарунак усталявалі ў часовай, драўлянай званіцы на тэрыторыі манастырскага комплексу, адкуль галасы званоў пачуюць насельнікі манастыра, мясцовыя жыхары і госці аграгарадка Жыровіцы.

Наогул, зазначае **намеснік старшыні Слонімскага райвыканкама Тэрэса ЮШКЕВІЧ,** да юбілею аграгарадок разам з манастыром пераўтварыліся: скончаны капітальны рамонт і рэстаўрацыя манастырскага брацкага корпуса, добраўпарадкавана цэнтральная плошча Жыровіцаў і іншыя аб'екты першай чаргі, днямі прывезены і ўсталяваны помнік вядомаму падзвіжніку веры Серафіму Жыровіцкаму.

Аўтарам помніка архімандрыту Серафіму стаў скульптар Дзмітрый Урублеўскі — менавіта яго праект летась перамог у конкурсе сярод шэрагу іншых творчых прапаноў. Стрымана-строгую бронзавую постаць вышынёй 3,5 метра паставілі на гранітным пастаменце каля ўваходу ў манастыр.

СТАР. 3

## Невычарпальная вера і няспынная малітва

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншавальнае пасланне суайчыннікам з нагоды 550-годдзя здабыцця цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзя заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нерукатворны абраз Найсвяцейшай Багародзіцы на гранітным камені з'яўляецца адной з галоўных праваслаўных святынь Беларусі, якія ўшаноўваюцца ва ўсім хрысціянскім свеце.

«Усведамляючы важнае значэнне духоўнага складніка ў фарміраванні традыцый беларускага народа і захаванні яго культурнай спадчыны, дзяржава аказвае ўсемагчымую падтрымку ў аднаўленні Жыровіцкай абіцелі. Нястомная малітоўная праца яе насельнікаў абуджае ў людзях дабро і любоў, надзею і міласэрнасць, аб'ядноўвае перад тварам любых выпрабаванняў», — цытуе віншаванне прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў перакананне, што манастыр і далей будзе заставацца вядучым цэнтрам праваслаўнай асветы, падтрымліваць нацыянальныя традыцыі талерантнасці і верацярпімасці, садзейнічаць умацаванню этнаканфесійнай згоды і стабільнасці ў грамадстве.

«Жадаю моцнага здароўя, невычэрпнай веры, поспехаў ва ўсіх пачынаннях у імя высокіх ідэалаў хрысціянства і працвітання беларускага народа», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Жыллё

## Рынак упіраецца, але ідзе на патаненне

Ва ўмовах стабілізацыі курса долара прадаўцы ўсё радзей ідуць на істотныя зніжкі. Разам з нашымі экспертамі мы паспрабуем спрагназаваць, чаго чакаць у гэтым сегменце ў сувязі з новымі выклікамі і як сітуацыя можа стабілізавацца

**Як мы ўжо пісалі ў пачатку красавіка, спачатку змяненне курсу беларускага рубля і сітуацыя з каранавірусам адбіліся на рынку жылля. Практычна ўсе яго ўдзельнікі замерлі ў стане нявызначанасці. Мы яшчэ тады выказалі здагадку, што людзі зноў пачнуць цікавіцца нерухомасцю толькі праз месяц. На думку нашага эксперта, ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктара Агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, у сітуацыі, калі на рынак абрынуліся ўсе форс-мажоры адначасова, людзям трэба час, каб прывыкнуць да новай рэальнасці і зразумець, як у ёй жыць і працаваць. Наш эксперт яшчэ заклікаў: «Сустрэнемся праз месяц»...**

СТАР. 2

Дарогамі Славы

75 Вялікая Перамога

## Іваны-разведчыкі

**Падбіраючы фатаграфіі поўных кавалераў ордэна Славы — кандыдатаў на гэтую публікацыю, я міжволі спыніўся на фактах ваеннай і пасляваеннай біяграфіі двух Іванаў — Шмеі і Дарошчанкі. На фронце яны абодва былі разведчыкамі, бралі «языкоў» — нямецкіх салдат і афіцэраў. Абодва тройчы былі параненыя, абодва ўдзельнічалі ў Парадзе Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве 1945 года. А ў цывільным жыцці іх любімымі заняткамі былі паляванне і рыбалка. Дзякуючы Івану Дарошчанку я даведаўся, што ў разведку бралі ў першую чаргу паляўнічых і рыбакоў, бо яны былі смелыя, спакойныя і ўважлівыя.**

**Пра Івана Шмею, жыхара Дзяржынска, у свой час пісалі ўсе беларускія газеты, яго называлі «Цёркіным», і невыпадкова: у Івана было падабенства з галоўным героем легендарнай паэмы «Васіль Цёркін» — столькі меў салдат адвагі, шанцавання, баявога задору. Ён быў на дзіва кампанейскі чалавек вясёлага нораву. Здольнасцяў у Шмеі таксама было хоць адбаўляй, нават у арміі ён навучыўся іграць на баяне. Нядрэнна валодаў пэндзлем — маляваў пейзажы на палотнах. Напярэдадні чарговага Дня Перамогі мне трэба было знайсці дастойнага героя для фотаздымка на першую старонку газеты, і я напрасіўся ў госці да Івана Сцяпанавіча. У маіх запісах гэты дзень пазначаны шостым мая восемдзесят восьмага года. Было што здымаць, але ветэран сам прапанаваў сюжэт, і мы разам з двума яго старэйшымі ўнукамі, прыхапіўшы з сабою баян, селі на паляўнічы «козлік» (аўтамабіль ГАЗ-69) і паехалі за ваколіцу Дзяржынска — шукаць прыдатнае месца для здымкаў.**



СТАР. 6

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Германія і Францыя прапанавалі план на паўтрыльёна еўра



Варта стварыць фонд аднаўлення еўрапейскай эканомікі агульным аб'ёмам 500 мільярдаў еўра, паведаміла федэральны канцлер Германіі Ангела Меркель пасля перагавораў з прэзідэнтам Францыі Эмануэлем Макронам. Паводле яе слоў, Берлін і Парыж хочуць дзейнічаць разам з астатнімі краінамі Еўрасаюза, але з дапамогай сваёй ініцыятывы маюць намер паслаць ім сігнал пра тое, што ЕС пераадолее гэты крызіс і выйдзе з яго мацнейшым. «Важна хутка аднавіць эканоміку. У гэтай сувязі мы хочам стварыць абмежаваны тэрмінамі фонд, які павінен выдзяляць сродкі бюджэту ЕС для найбольш пацярпелых сектараў і рэгіёнаў», — заўважыла Меркель. Па словах Эмануэля Макрона, прыярытэтнай задачай з'яўляецца стварэнне «здаровай Еўропы». Таму прапанаваны фонд павінен аказваць дапамогу краінам ЕС, якія маюць у гэтым патрэбу, бязвыплатна. Але для рэалізацыі такой прапановы спатрэбіцца згода ўсіх краін Еўрасаюза.

### ЗША запусцілі на арбіту сакрэтны ваенны касмаплан

Ваенна-паветраныя сілы ЗША з базы на мысе Канаверал правялі паспяховы запуск ракеты-носьбіта Атлас V з сакрэтным арбітальным выпрабавальным караблём (касмапланам X-37B) на борце. Пра гэта паведамляе BBC News. Падчас касмічнай місіі апарат запусціць на арбіту спадарожнік і пратэстуе энергапрамянёвую тэхналогію. Акрамя гэтага, у космасе будзе праведзены эксперымент па ўплыве радыяцыі на насенне раслін і іншыя аб'екты. Запуск стаў шостым для эксперыментальнага арбітальнага карабля. Праграма X-37B стартавала ў 1999 годзе. Касмаплан нагадвае паменшаную версію пілатаваных касмічных караблёў, выведзеных з эксплуатацыі касмічнай праграмай ЗША ў 2011 годзе. Ён можа зніжацца з верхніх слаёў атмасферы і прызямляцца на ўзлётна-пасадачную паласу, як «Шатл». Арбітальны беспілотны самалёт выкарыстоўвае сонечныя батарэі для сілкавання на арбіце, яго даўжыня складае больш за 9 метраў, размах крылаў — амаль 4,5 метра.

### З-за суперцыклона ў Індыі і Бангладэш эвакуіруюць мільёны жыхароў



У Бенгальскім заліве на густанаселеныя раёны Індыі і Бангладэш насоўваецца суперцыклонны шторм, або, як яго называюць індыйскія метэаролагі, суперцыклон «Амфан». Краіны прыступілі да эвакуацыі больш чым 2 мільёнаў чалавек, чые дамы знаходзяцца ў патэнцыйна небяспечных раёнах. Напярэдадні хуткасць ветру паблізу цэнтра суперцыклона складала 230-240 кіламетраў у гадзіну, парывы дасягалі 255 км/г. Па прагнозах, «Амфан» выйдзе на сушу ў другой палове дня 20 мая. Гэта адбудзецца на ўчастку ўзбярэжжа паміж горадам Дзіга індыйскага штата Заходняя Бенгалія і вострвам Хаціа ў Бангладэш. Хуткасць ветру пры гэтым паменшыцца да 155-165 км/г, парывы — да 185 км/г, інфармуе Дэпартамент метэаралогіі Індыі (IMD). Мясцовыя метэаралагічныя службы папярэджваюць, што гэты цыклон можа стаць самым магутным для рэгіёна з 2007 года, калі цыклон «Сідр» забраў жыцці больш чым 3 тысяч чалавек.

ISSN 1990 - 763X
9 771990 763008 20096

### КОРАТКА

• Прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне анлайн можна на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

• **У Гомелі на лікёра-гарэлачным заводзе пачалі вырабляць антысептычныя растворы.**



• Анлайн-праекты Купалаўскага тэатра ўбачыла каля 100 тысяч гледачоў.

• **80 % насельніцтва Беларусі лічыць актуальнай праблему збору і перапрацоўкі адходаў.**

• Больш за 3 тысячы злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій зарэгістравана ў Беларусі з пачатку года.

• **Вялікабрытанія забараняе свабодную працоўную іміграцыю з Еўропы.**





## ВАКАЦЫІ БЕЗ ПРАБЛЕМ

Як правільна арганізаваць дзіцячы адпачынак?

**Летась у Мінскай вобласці ў агні не загінуў ніводны малы. Нуль у гэтай графе значыцца і па прамежкавых выніках 2020 года. Разам з тым вакацыі для дзяцей — гэта не толькі безліч вольнага часу падчас адпачынку ў вялікім горадзе або вёсцы, але і большая рызыка трапіць у небяспечную сітуацыю. Асабліва калі побач няма дарослых. Каб больш даведацца аб правілах бяспекі ўлетку, карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да афіцыйнага прадстаўніка Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Настассі ШВАЙБОВІЧ.**



### ЯК МАЛЫЯ ПОЛЕ СПАЛІЛІ

У мінулым годзе відавочца ў Дзяржынскім раёне паведаміў на нумар 101, што гарыць поле. Сітуацыя складвалася вельмі небяспечная. Па-першае, гэта быў час, калі актыўна ішло жніво. Па-другое, некалькі дзён да выпадку трымалася сухое і даволі цёплае надвор'е. У дзень, калі гэта здарылася, усчаўся парывісты вецер. А гэта значыла, што агонь мог распаўсюджвацца вельмі хутка.

Самае цікавае, што ратавальнікам пазваніў малы. У сваю чаргу, супрацоўнікі міліцыі, якія выехалі на месца падзей для разбіральніцтва, знайшлі на пажарышчы... моцна абгарэлую і счарнелую дзіцячую байку. А пасля з хмызняку вылез і сам яе ўладальнік. Моцна напалоханы хлопчык прызнаўся, што ён прыбег паглядзець, ці патушылі полымя. Падчас следства высветлілася, што ён і ёсць адзін з падпальшчыкаў гэтага самага поля...

СТАР. 3

# «Паваротны пункт на шляху аднаўлення эканомік»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па прапанове Аляксандра Лукашэнкі пасяджэнні ў вузкім і пашыраным складзе былі аб'яднаныя ў адно, і ў ім узяў удзел лідар краіны — назіральніка ЕАЭС Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон.



Фота БелТА.

## Тры сотні крокаў у бок адной мэты

Пра змест праекта Стратэгіі развіцця еўразійскай інтэграцыі да 2025 года далажыў старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Міхаіл Мясніковіч. У дакуменце ў 333 мерах і механізмах выкладзены кірункі інтэграцыі, прапісана, як магчыма завяршыць фарміраванне рынкаў без бар'ераў і выключэнняў. Для выхаду з крызісных з'яў стаўка робіцца на ўласныя магчымасці саюза. Такі падыход апраўдвае распрацоўку сумесных мэтавых праграм для падтрымкі прадпрыемстваў, што маюць кааперацыі з вытворчасцямі іншых краін саюза. Ёсць нормы, якія рэгулююць павышэнне якасці жыцця грамадзян (ахову здароўя, турызм, спорт). Не абышоў дакумент і актуальнае пытанне апошніх гадоў — лічбавізацыю. У гэтым ключы ў саюзе будуць развіваць электронны гандаль. Стратэгія таксама прапаноўвае пашырэнне гандлёвых адносін з трэцімі краінамі, партнёрства з Кітаем па ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях». Па словах Міхаіла Мясніковіча, праект стратэгіі — гэта толькі кірункі, а сутнасць — у дакументах, якія неабходна распрацаваць на іх аснове.

Старшыня ЕЭК дадаў, што акрамя фарміравання цэн на пампаванне газу ў рамках агульнага рынку рознагалоссяў па праекце няма.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Арменія Нікол Пашынян назваў газавае пытанне ключавым для Еўразійскага эканамічнага саюза і выказаў думку, што яго выключэнне са стратэгіі не пойдзе на карысць аб'яднанню. Падобнай пазіцыі па пытанні фарміравання цаны на транспарціроўку газу прытрымліваецца і Беларусь.

Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў зрабіў заўвагу яшчэ па шэрагу пунктаў, якія не адносяцца непасрэдна да эканомікі (у прыватнасці, па адукацыі) і прапанаваў адобрыць дакумент у цэлым, а крыху пазней, выправіўшы ўсе пытанні, канчаткова яго прыняць.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што Стратэгію развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года можна будзе падпісаць пры вочнай сустрэчы. Да таго ж дакумент не мае прапаноў, тэрміновых да рэалізацыі.

У выніку праект кіраўнікамі дзяржаў у цэлым ухвалены і адначасова адпраўлены на дапрацоўку.

## Плюс Куба?

На пасяджэнні было таксама разгледжана пытанне аб заяве Рэспублікі Куба на атрыманне статуса дзяржавы-назіральніка пры Еўразійскім эканамічным саюзе.

«Гэта наш партнёр, саюзнік, дзяржава, якая заўсёды была арыентавана на нас, на Савецкі Саюз», — ахарактарызаваў заяўніка Старшыня ВЭЕС Аляксандр Лукашэнка.

Па словах старшыні Калегіі ЕЭК Міхаіла Мясніковіча, Куба дэманструе вялікі інтарэс да ўзаемадзеяння з ЕАЭС ці не з моманту яго запуску ў 2015 годзе. Беларусь, Кіргізія і Арменія згодныя на наданне Кубе статусу назіральніка. Казахстан лічыць неабходным правесці дадатковыя кансультацыі з кубінскім бокам, а ў далейшым распрацаваць крытэрыі для дзяржаў-назіральнікаў. Расія прапанавала правесці кансультацыі дзяржаў — членаў ЕАЭС з Гаванай для ўдакладнення ўсіх аспектаў, звязаных з чаканнямі кубінскага боку.

Старшыня Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета даручыў ЕЭК больш сур'ёзна падключыцца да вырашэння гэтага пытання, каб завяршыць работу да наступнага саміту.

## Да сустрэчы ў Мінску. Вочнай

Кіраўнікі дзяржаў таксама вызначылі асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза на 2020—2021 гады, удакладнілі механізм фарміравання кадравага складу Еўразійскай эканамічнай камісіі, унеслі змяненні ў Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года ў частцы ўплаты падатку на дабаўленую вартасць пры імпарце тавараў на тэрыторыю свабоднай эканамічнай зоны, разгледзелі іншыя пытанні.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Варвара МАРОЗАВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**

# Адкладзіце да жніўня

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ нумар 172 «Аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння дакументаў»

**Згодна з указам, выдадзеныя фізічным і юрыдычным асобам (у тым ліку і індывідуальным прадпрымальнікам) даведкі і дакументы, тэрмін дзеяння якіх заканчваецца ў перыяд з 30 красавіка да 31 ліпеня 2020 года, застануцца дзеючымі яшчэ тры месяцы. Напрыклад, калі тэрмін дзеяння дазволу завяршаецца 15 мая 2020 года, то ён будзе прадоўжаны аўтаматычна да 15 жніўня 2020 года. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу кіраўніка дзяржавы.**

Пастановай Савета Міністраў будуць вызначаны вычарпальныя пералікі дакументаў, тэрмін дзеяння якіх прадаўжаецца, і найменняў адміністрацыйных працэдур, пры ажыццяўленні якіх такія дакументы выдаюцца.

У перыяд складанай эпідэміялагічнай абстаноўкі прапанаваныя меры дадуць магчымасць скараціць колькасць наведванняў дзяржаўных органаў (арганізацый) для афармлення неабходных дакументаў, знізіць адміністрацыйную нагрузку на грамадзян і суб'екты гаспадарання, адкласці на тры месяцы іх фінансавыя расходы.

Паводле наяўнай у БелТА інфармацыі, пастанова Савета Міністраў, якая вызначае пералік дакументаў і працэдур, будзе прынята і апублікавана ў найбліжэйшы час. Мяркуецца, што ў яе будуць уключаны, у прыватнасці, працэдуры выдачы медыцынскай даведкі аб стане здароўя, пашпарта грамадзяніна Беларусі (для тых, хто пражывае ў сваёй краіне) у сувязі з дасягненнем 14-гадовага ўзросту, пасведчання на права кіравання механічным транспартным сродкам. Акрамя таго, у пералік дакументаў, якія падлягаюць прадаўжэнню, прапануецца ўключыць сертыфікаты прадукцыі (работ, паслуг) уласнай вытворчасці, у тым ліку паслуг банкам, нябанкаўскім крэдытна-фінансавым, страхавым арганізацыям, камерцыйным мікрафінансавым арганізацыям і лізінгадаўцам.

У цэнтры ўвагі

# Талентам — адрасная падтрымка

**Больш за 1 мільён рублёў накіруюць на падтрымку адораных навучэнцаў і студэнтаў.**

Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У адпаведнасці з дакументам стыпендыі фонду прызначаны 199 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі.

Пераможцам XVI Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіяды па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы і Міжнароднай студэнцкай алімпіяды ў галіне інфарматыкі і праграмавання 2019 года прысуджаны грашовыя прэміі або заахвочвальныя стыпендыі з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду.

Пераможцы міжнароднай алімпіяды школьнікаў па фізіцы, хіміі і матэматыцы 2019 года, алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» 2019 года і XXI Рэспубліканскага турніру юных матэматыкаў заахвочаны грашовымі прэміямі. Усяго на гэтыя мэты за кошт сродкаў рэзервовага фонду кіраўніка дзяржавы з рэспубліканскага бюджэту выдзелена больш за 1 мільён рублёў. Іх плануецца накіраваць на заахвочванне 321 навучэнца і студэнта.

Прыняцце распараджэння Прэзідэнта накіравана на забеспячэнне адраснай дзяржаўнай падтрымкі адораных навучэнцаў і студэнтаў, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага развіцця іх здольнасцяў і паспяховай вучобы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Пуцеправод, басейны і добраўпарадкаванне

## У Віцебску восенню ўпершыню пройдуць абласныя «Дажынкі». Вядзецца актыўная падрыхтоўка

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ патрабаваў ад кіраўніцтва Віцебскага гарвыканкама, каб да «Дажынак» абласны цэнтр заззяў новымі фарбамі, і паабяцаў падтрымку з абласнога бюджэту.**

Дарэчы, да «Дажынак» гараджане атрымаюць шмат прыемнага і, што важна, насамрэч вельмі неабходнага Віцебску. Самы чаканы аб'ект — Полацкі пуцеправод, які знаходзіцца каля аўтавакзала і недалёка ад чыгуначнага вакзала. Цікава, што па суседстве зробяць больш прывабным сквер на вуліцы Кірава. Менавіта яго ў першую чаргу бачаць прыезджыя, таму можна гэтую зялёную зону назваць адной з візітовак горада.

Паралельна працуюць яшчэ на многіх «дажыначных» будаўнічых пляцоўках. Прыгажосць наводзяць на вуліцах Замкавай, Леніна, праспекце Фрунзэ, у гістарычным цэнтры. У прыватнасці, мяняюць бардзюры на гранітныя, замяняюць балконы, выкладваюць новую плітку на тратуарах. Мадэрнізуюць фасады некалькіх медыцынскіх устаноў, унутры праводзіцца пераабсталяванне.

Больш за дзесяць устаноў адукацыі адаптуюць да патрабаванняў часу. У школах і садках правядуць капітальны рамонт, створаць гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі замест тых, якія маральна састарэлі. Напрыклад, у СШ № 31 мадэрнізуюць басейн, што функцыянуе з савецкіх часоў. У мікраараёне Білева здадуць у эксплуатацыю школу, разлічаную на 1020 вучняў, — між іншым, адзіную ў Віцебску з двума басейнамі.

Дарэчы, у тым жа Білеве хутка будзе прыемная змена. Туды з праспекта Будаўнікоў можна будзе даехаць па новай дарозе, якой раней не было. Гэта значна скароціць шлях, створыць транзітнікам магчымасць хутчэй пераадолець гарадскія вуліцы. А там, дзе пачынаецца будучая дарога, — у раёне вытворчага прадпрыемства «Віцязь» — запланавана здаць пад ключ падземны пераход, які доўгі час лічыўся даўгабудам.

Губернатар даручыў не забываць і пра ўскраіны — асаблівая ўвага ўдзяляецца прыватнаму сектару, якога ў Віцебску шмат...

Штодня змяняецца выгляд плошчы Свабоды і прылеглай тэрыторыі. Напрыклад, у парку Фрунзэ літаральна на вачах становяцца ўсё больш прывабнымі ратонды: тут усталёўваюць новыя малыя архітэктурныя формы. А побач — на праспекце Фрунзэ — ужо з'явілася лаўка ў «базарным стылі». Сядзячы на ёй, можна праз дарогу бачыць Летні амфітэатр.

Сярод укладанняў, якія будуць прыносіць грошы ў мясцовы бюджэт, — завод па перапрацоўцы смецця.

«Дажынкі» пройдуць, а значныя змены ў Віцебску застануцца і будуць служыць мясцовым жыхарам дзясяткі гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Блізкая ўлада

# МАКСІМАЛЬНЫ ЭФЕКТ

**Правядзенне прамых тэлефонных ліній — гэта дастаткова дзейсны спосаб сувязі паміж гарадскімі ўладамі і жыхарамі сталіцы, таму што дазваляе кіраўніцтву горада атрымаць жывую зваротную сувязь з насельніцтвам. Такое меркаванне выказаў журналістам памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску Віталь ПРЫМА падчас прыёму грамадзян у Мінгарвыканкаме.**

— Пры правядзенні прамых тэлефонных ліній мы імкнёмся максімальна ўнікнуць ва ўсе праблемы насельніцтва, разабрацца разам са спецыялістамі і вызначыць шляхі іх вырашэння, — адзначыў ён. — Калі бачым, што звяртаюцца па падобнай тэматыцы, гэта сведчыць аб тым, што ў адпаведнай сферы існуюць праблемы і іх трэба вырашаць праз арганізацыйныя меры, змену заканадаўства ці іншым спосабам. У цэлым жа гэта жывая зваротная сувязь з людзьмі, якія аператыўна могуць данесці пытанні, што іх хвалююць, да кіраўніцтва горада.

Часцей за ўсё сталічных жыхароў непакояць пытанні, звязаныя са сферай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У прыватнасці, гэта датычыцца добраўпарадкавання, капітальнага рамонту двароў і пад'ездаў, утрымання тэрыторый і нежылых памяшканняў. Памочнік Прэзідэнта адзначыў, што работа па рэарганізацыі сістэмы ЖКГ у Мінску, якая праводзілася з 2015 года, дала свае станоўчыя вынікі: людзі цяпер разумеюць, за якія паслугі і колькі трэба плаціць, аднак засталіся яшчэ кірункі, якія трэба ўдасканаліць. Гэта датычыцца кадравых і арганізацыйных пытанняў.

Таксама да Віталя Прымы звярталіся шматдзетныя сем'і, якіх цікавілі пытанні прызначэння і выкарыстання дзяржпадтрымкі. На некаторыя з іх спецыялісты адразу далі тлумачэнні на аснове існуючага заканадаўства, па іншых агучаных праблемах спатрэбіцца дадатковае вывучэнне. Памочнік Прэзідэнта акцэнтаваў увагу на неабходнасці тлумачальнай работы для шматдзетных сям'яў, каб яны маглі атрымаць дапамогу з боку дзяржавы своечасова і ў поўным аб'ёме.

Таксама на прамой лініі прагучала пытанне наконт звышнарматыўнага тэрміну будаўніцтва. Напрыклад, мінчанка, дом якой будуецца па вуліцы Быхаўскай з 2015 года, занепакоена тым, што забудоўшчык кінуў усе свае намаганні на работы ў першым пад'ездзе, у той час як у другім яны нават не распачаты. Жанчына хоча, каб дом уводзіўся ў эксплуатацыю цалкам, а не пускавымі комплексамі.

Агучаныя тэмы будуць узяты на кантроль: адміністрацыям раёна даручана прымаць меры па ліквідацыі выяўленых недахопаў.

— Часам, калі людзі звяртаюцца да нас, відаць, што многія пытанні разгледжаны павярхоўна, таму наша задача — паглыбіцца ва ўсе гэтыя працэсы і знайсці нестыкоўкі, якія існуюць, накіраваць мясцовыя органы ўлады на вырашэнне праблем канкрэтных людзей, — растлумачыў памочнік Прэзідэнта.

Ён паведаміў, што асабіста практыкуе выезды на месцы разам са спецыялістамі Мінгарвыканкама, каб азнаёміцца з той ці іншай праблемай, высветліць яе маштабы і вызначыць дакладны алгарытм работы.

**Паводле БелТА.**

Экспертыза

# МАГАТЭ апублікавала справаздачу па БелАЭС

**Вынікі жнівеньскай місіі Міжнароднага агенцтва па атамнай энергетыцы (МАГАТЭ) па Беларускай АЭС — 11 рэкамендацый, восем прапаноў і чатыры добрыя практыкі, якія можна рэалізоўваць на іншых атамных электрастанцыях свету — апублікаваны на сайце агенцтва. Характарыстыкі станцыі на адпаведнасць стандартам бяспекі МАГАТЭ правяралі эксперты з Арменіі, Бельгіі, Бразіліі, Францыі, Нідэрландаў, Расіі, Славакіі і ЗША.**

Добрай практыкай на Беларускай АЭС прызналі надзейную сістэму апавяшчэння, якая можа не толькі падаць сігнал трывогі, але і выкарыстоўвацца для выдачы моўнай інфармацыі і інструкцый насельніцтву ў выпадку радыелагічных і іншых аварыйных сітуацый. Сярод найбольш значных рэкамендацый для АЭС адзначаецца неабходнасць палепшыць нагляд і кантроль за праграмамі ўводу ў эксплуатацыю для забеспячэння гатоўнасці станцыі да бяспечнай работы. Эксплуатуючай арганізацыі — дзяржаўнаму прадпрыемству «Беларуская атамная станцыя» — параілі палепшыць праграму прадухілення патэнцыйнага пападання пабочных прадметаў у важныя для бяспекі сістэмы і элементы станцыі.

Падчас візіту прадстаўнікі місіі праверылі 11 кірункаў. У тэксце справаздачы МАГАТЭ адлюстраваны вынікі толькі ў тых абласцях, дзе каманда экспертаў лічыць за лепшае сфармуляваць рэкамендацыі, прапановы і адабрэнні. Іншыя аспекты дзейнасці, якія разглядаліся, але дзе не былі выяўлены прабелы, у справаздачу не ўвайшлі.

Кіраўніцтва станцыі запэўніла, што гатова прыняць паўторную місію МАГАТЭ праз паўтара года.

**Ірына СІДАРОК.**

# Рынак упіраецца, але ідзе на патанненне

## Красавіцкія антырэкорды па здзелках

Месяц прайшоў. Паводле звестак Нацыянальнага кадастравага агенцтва, за красавік у Мінску было прададзена 590 кватэр (без уліку доляў і пакояў) — самы нізкі паказчык за апошнія пяць гадоў. Усяго было рэалізавана 31,7 тысячы квадратных метраў жылля, што ў 2,2 разы менш, чым за папярэдні месяц. Такі абвал попыту да гэтага часу можна было назіраць толькі ў пачатку года пасля доўгага перыяду святочных дзён. Прырода цяперашняга абвалу чымсьці падобная, толькі замест свят у патэнцыйных пакупнікоў кватэр сёння рэжым самаізаляцыі і жаданне адкласці любыя значныя справы на пазнейшы тэрмін.

На думку аналітыка рынку нерухомасці Арцёма Сахарэвіча, у красавіку яшчэ закрываліся старыя здзелкі, падрыхтоўка да якіх ішла ў мінулыя месяцы. Па выніках мая і чэрвеня ўжо можна будзе ацэньваць жывучасць другаснага рынку ў новых умовах, у тым ліку пасля згортвання крэдытаў на куплю жылля ўсіх найбуйнейшых банкаў. Не выключана, што ўстаноўлены ў красавіку антырэкорд доўга не пратрымаецца.

Зусім іншая сітуацыя складваецца ў прадаўцоў. Прапанова новых кватэр у апошні месяц расла значна хутчэй за тыя тэмпы, з якімі іх куплялі на рынку. А ў выніку ў красавіку сукупны аб'ём прапановы вырас яшчэ на 6,5 %. На адну прададзеную ў красавіку кватэру прыходзілася 14 выстаўленых на продаж — такой высокай канкурэнцыі за пакупніка не было з пачатку 2016 года. Яшчэ зусім нядаўна, у лютым, суадносіны складалі 1 да 5. Падзенне попыту было больш прыкметнае ў двухпакаёвых і трохпакаёвых кватэр — такія кватэры часта ўдзельнічаюць у складаных разменных ланцужках, якія ў перыяд нестабільнасці разрываюцца.

## Плюсы і мінусы

Так, цэны знізіліся, але толькі ў доларавым эквіваленце. Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага кадастравага агенцтва (НКА) Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Дзмітрый РЫТВІНСКІ,** сярэдні кошт квадратнага метра на першасным рынку на аднапакаёвыя кватэры ў параўнанні з сакавіком знізіўся на 12,2 % і склаў 1370 долараў. Для двухпакаёвак — адпаведна 6,4 % і 1310 долараў. Прыкметней за ўсё на першасным рынку патаннелі трохпакаёвыя кватэры. Цяпер яны каштуюць 1170 долараў за квадратны метр (мінус 15,8 % у параўнанні з сакавіком).

Паводле звестак НКА, на другасным рынку зніжэнне цэн пакуль не такое значнае. Сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвай кватэры знізіўся да 1440 долараў у эквіваленце (мінус 3,4 %), а двухпакаёвай — да 1250 долараў (мінус 3,8 %). Паказчык для трохпакаёвак застаўся на ўзроўні сакавіка — 1200 долараў за «квадрат».

Зрэшты, пры зніжэнні кошту ў доларах цаннік у рублях вырас. Сярэдняя цана квадратнага метра аднапакаёвай кватэры вырасла на 1,7 %, двухпакаёвай — на 1 %, трохпакаёвай — на 5,6 %.

Варта адзначыць, што ў красавіку сярэдні кошт квадратнага метра знізіўся ў шасці з дзевяці раёнаў Мінска. Калі ў Цэнтральным раёне (1360 долараў, што на 8,1 % менш, чым у першым квартале), Партызанскім (1230 долараў — мінус 6,1 %), Савецкім (1330 долараў — мінус 5,7 %), Маскоўскім (1330 долараў — мінус 5 %), Фрунзенскім (1310 долараў — мінус 0,8 %) і Першамайскім (1370 долараў — мінус 0,7 %) адбывалася патанненне кватэр, то ў Кастрычніцкім, Ленінскім і Заводскім раёнах сярэдні кошт квадратнага метра нават вырас.

На думку Арцёма Сахарэвіча, структура попыту з пункту гледжання геаграфіі і якасных характарыстык жылля нязначна адрознівалася ад сакавіцкай. У маі-чэрвені мы, напэўна, убачым больш прыкметныя зрухі ў пакупніцкіх перавагах. Калі ў сакавіку цэны рэальных здзелак раслі па інерцыі за кошт спрыяльнай сітуацыі ў першай палове месяца, то красавіцкая дынаміка ўжо была адмоўная. Сярэдні кошт прададзеных кватэр у Мінску знізіўся на 2,4 % і склаў па выніках красавіка 1354 долараў за квадратны метр. Гэта вельмі істотная карэкцыя для аднаго месяца — максімальная за апошнія чатыры гады.

## Далей толькі пошук «дна»

Цэны працягнуць зніжацца, і дзе цэнавае «дно», цяпер не спрагназуе ніхто: яшчэ рана пра гэта казаць, лічыць Дзмітрый Рытвінскі. На думку спецыяліста, рынак нерухомасці толькі пачаў рэагаваць на новую рэальнасць. Адмена банкамі выдачы крэдытаў пад куплю нерухомасці не дадае аптымізму. «Думаю, што бліжэй да канца другога квартала мы ўбачым ужо больш выразны трэнд таго, што адбываецца на рынку нерухомасці. Што ж датычыцца колькасці здзелак, то мяркуецца, што ў маі-чэрвені іх колькасць будзе ніжэйшая за сярэдняе значэнне за апошнія 12 месяцаў», — упэўнены прадстаўнік кадастравага агенцтва.

У сваю чаргу, Арцём Сухарэвіч лічыць, што цэны ў аб'явах у красавіку зніжаліся не такімі тэмпамі, як у рэальных здзелках, — адбыўся масавы выхад на рынак новых аб'ектаў з даволі высокімі коштамі. Характэрна, што «хрушчоўкі» патаннелі мацней, чым сучаснае жыллё.



Як мы ўжо пісалі, з пачатку мая Беларусбанк прыпыніў выдачу крэдытаў на набыццё другаснага жылля, але захаваў іх для будаўніцтва. І хоць пакуль не ўсе банкі пераанялі яго прыклад, такі выбіральны падыход найбуйнейшага фінансавага гульца стварае няроўныя ўмовы для функцыянавання першаснага і другаснага рынкаў жылля. З улікам будучага зніжэння стаўкі рэфінансавання да рэкордна нізкіх 8 % гадавых новабудоўлі хутчэй адчуюць аднаўленне попыту і здолеюць пазбегнуць значнай цэнавай карэкцыі.

Што датычыцца другаснага рынку жылля, то тут магчымыя два варыянты паводзін прадаўцоў. Першы — адчувальныя зніжкі і працяглы гандаль «да перамогі» з мэтай прыцягнуць увагу пакупнікоў з накапленнямі або крэдытамі, што засталіся на другасным рынку ад некалькіх банкаў.

Але ва ўмовах стабілізацыі курсу долара пераважная большасць прадаўцоў ужо неахвотна перапісвае цэны. Месяц таму гаворка ішла аб масавай карэкцыі цэн у аб'явах, але ў апошнія тыдні гэты працэс заціх: карэкціроўкі сталі рабіць не часцей, чым у пачатку месяца. Калі такая сітуацыя будзе развівацца на сталічным рынку нерухомасці паскоранымі тэмпамі, то гэта можа прынесці забудоўшчыкам адразу некалькі праблем. Новабудоўлям давядзецца канкурыраваць з тымі, хто хоча прадаць кватэру максімальна хутка і гатовы да сур'ёзных саступак. І тады перад пакупнікамі паўстане выбар: альбо купляць дарагую кватэру ў новабудоўлі з гарантаваным крэдытам, або таннейшую на другасным рынку, на якую яшчэ дзесьці трэба знайсці грошы.

Акрамя таго, усім вядома, што перад купляй кватэры ў новабудоўлі многія прадаюць сваё старое жыллё. Тут раскрываецца другі «падводны камень», які тоіцца ў слабым попыце на «старыя» кватэры і нежаданні многіх уласнікаў ісці на вялікія зніжкі. Няўжо забудоўшчыкі будуць вымушаныя рабіць пакупнікам яшчэ буйнейшыя зніжкі на сваё жыллё? Час пакажа.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Май на ўвазе

# Пайду ў краму па наяўныя

**У нашай краіне дазволілі здымаць наяўныя з банкаўскай карткі праз касу крамы. Гэта рэгламентавана пастановай Савета Міністраў і Нацыянальнага банка ад 15 мая.**

Такі механізм уводзіцца гэтым летам у вёсках. Згодна з прынятым дакументам, у сельскай мясцовасці, малых гарадскіх пасёлішчах, на тэрыторыі па-за населенымі пунктамі выдача наяўных трымальнікам банкаўскіх картак праз касавае абсталяванне магчымая ўжо з 5 чэрвеня. На астатняй тэрыторыі краіны гэта можна будзе зрабіць з першых дзён 2022 года.

У пастанове адзначаецца, што выдаваць грошы змогуць юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія рэалізуюць тавары і аказваюць паслугі насельніцтву. Сума наяўных, якая выдаецца ў рамках адной аперацыі, можа складаць не больш за 5 базавых велічынь (135 рублёў).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ну і ну!

# А грошы былі... сувенірныя

**У Цэнтральнае РУУС сталіцы паступіла паведамленне: на аўтарынку пакупніца аўтамабіля перад здзелкай выявіла згубу грошай. З яе слоў, з сумкі скралі 26 тысяч долараў і 20 тысяч еўра. Сышчыкі, якія прыбылі для разбору, устанавілі, што на самай справе злачынства не здзяйснялася. Падрабязнасці гэтай незвычайнай гісторыі паведамляе МУС.**

Жанчына прызналася, што патэлефанавала ў міліцыю дзеля таго, каб схаваць праўду ад мужа, з якім прыехала на аўтарынак. Доўгі час заяўніца ўводзіла мужчыну ў зман і запэўнівала, што рэгулярна адкладае грошы, зробленыя камерцыяй. На самай справе даходы траціліся на асабістыя і сямейныя патрэбы.

Муж і жонка прыехалі ў Мінск, каб не толькі купіць машыну, але і ўнесці задатак на куплю кватэры для дачкі. Напярэдадні паездкі было вырашана пералічыць грошы. Пад маркай таго, што гэта могуць убачыць суседзі, жанчына папрасіла мужа завесіць шторы і пагасіць святло. На самай справе гэта рабілася для таго, каб ён не заўважыў падмену — замест сапраўднай валюты жанчына пералічвала сувенірныя еўра і долары, якія яна некалькі гадоў таму купляла для выкупу нявесты на вясельным конкурсе. На аўтарынку, пакуль муж размаўляў з прадаўцом, жанчына ўпотайкі дастала з сумкі сувенірныя грошы і схавала іх, пасля чаго паведаміла пра крадзеж.

Па прычыне таго, што ўсе абставіны былі ўстаноўлены да прыняцця заявы аб злачынстве, у дачыненні да заяўніцы склалі адміністрацыйны пратакол за заведама лжывае паведамленне, што пацягнула прыняцце мер рэагавання міліцыяй. Цяпер жанчына чакае суда. Ёй пагражае штраф да 15 базавых велічынь.

У МУС нагадалі, што пры звароце ў органы ўнутраных спраў з заявай аб злачынстве міліцыянеры папярэджваюць чалавека аб крымінальнай адказнасці за заведама лжывы данос, пра што робіцца адпаведная адзнака ў заяве.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

На слыху

# ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПАНІКАВАЦЬ

## Нагадваюць магілёўскія медыкі, якія змагаюцца супраць COVID-19

**Калі бальніцы, дзе лечаць каранавірусных хворых, можна ўмоўна назваць сёння перадавой, то служба хуткай дапамогі або паліклініка — гэта наогул міннае поле. Там людзі працуюць з нябачным ворагам, нават не ўяўляючы сабе, дзе ён прытаіўся. Нашы сённяшнія героі — якраз з іх ліку.**

**Ганна АЎЧЫННІКАВА — фельчар падстанцыі № 5 Магілёўскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі.** Прыйшла сюды працаваць шэсць гадоў таму пасля магілёўскага медкаледжа. Выязджае самастойна і ў складзе брыгады на аказанне дапамогі жыхарам абласнога цэнтра і Магілёўскага раёна: мерае ціск, праводзіць неабходную дыягностыку і ставіць папярэдні дыягназ.



Ганна АЎЧЫННІКАВА з кіроўцам Васілём ДЗЕНІСЕНКАВЫМ.

— Першыя падазраваныя на COVID-19 з'явіліся ў канцы сакавіка, — згадвае суразмоўніца. — Яны паведамлялі, што прыехалі з краін, дзе ўжо быў каранавірус. Знешне нічым ад класічных хворых на ВРВІ не адрозніваліся. Тэмпература, ненадакучлівы кашаль. Мы надзявалі касцюмы ўзмоцненай абароны, бахілы, нарукаўнікі, фартухі, рэспіратары, акуляры, пальчаткі і ехалі. Наогул людзі рэагуюць на новую хваробу па-рознаму: у кагосьці спалох, у кагосьці слёзы, нехта сябе абвінавачвае ў тым, што заразіўся, а вось у кантактаў першага ўзроўню часцей за ўсё бывае гнеў — злуюцца, што іх, магчыма, заразілі. Але хвароба не выбірае, нікога вінаваціць не трэба. Тым больш што хворыя сапраўды пакутуюць, лічаць сябе нейкім злом для астатніх, баяцца, што не выйдуць з бальніцы. Такіх трэба яшчэ і супакоіць. Тут усё — справа выпадку. Мы ездзім у аўтобусе, ходзім у краму і не ведаем, хто побач. Нездарма прыдумалі сацыяльную дыстанцыю. Я заўсёды яе выконваю, і бацькоў прымушаю насіць маскі і пальчаткі.

Суразмоўніца ўдакладняе, што машыны, у якіх перавозяць інфіцыраваных, апрацоўваюцца і герметызуюцца, каб не было ўцечкі віруса ў кабіну кіроўцы або на вуліцу. Пасля кожнага такога хворага машына цалкам апрацоўваецца дэзынфіцыруючымі сродкамі.

На дзяжурстве Ганна суткі праз двое. Бывала, што па 12 гадзін даводзілася вазіць выключна «кавідных» пацыентаў. Адзявалася ў супрацьчумны касцюм, завозіла хворага, пераапраналася, праходзіла дэзапрацоўку, апраналася па новай і зноў ехала. За красавік, удакладняе, вывезла 40 «кавідных» пацыентаў.

— На «хуткай» наогул страху быць не павінна, — кажа дзяўчына. — А калі працуеш ва ўмовах пандэміі — гэта як на вайне. Толькі праціўнік у нас нябачны. Зайшла, убачыла спалоханыя вочы пацыента, супакоіла, апытала — і паехалі. Даводзілася вазіць цэлыя сем'і разам з дзецьмі. Малыя глядзяць на нас, як на іншапланецян, ім цікава. А вось дарослыя пакутуюць, не ведаюць, дзе гэтую заразу падхапілі. Кажуць, што хадзілі ў масках і пальчатках, але гэтага не праверыш. Некаторыя проста падстрахоўваюцца.

Дзяўчына жыве разам з бацькамі, але, кажа, яны бачаць яе толькі, калі яна спіць. Вельмі стамляецца. Але нельга сказаць, што раней жыццё было прасцейшае: і тады хапала людзей з пнеўманіямі і тэмпературай, былі нават успышкі свінога грыпу. І ўсё абышлося.

Па характары Ганна дамасед, таму абмежаванні пераносіць дастаткова лёгка. На вуліцу лішні раз стараецца не выходзіць, толькі па неабходнасці — у краму, напрыклад. Але адпачынак на моры давядзецца адкласці да лепшых часоў, уздыхае яна. Нават калі граніцы адкрыюцца, нельга рызыкаваць. Менш стала бачыцца з бабуляй, якая жыве таксама ў Магілёве, але што рабіць — гэта неабходнасць.

Ганна вельмі ўдзячна ўсім, хто сёння іх падтрымлівае ў рабоце. «Мяса & Лаваш» прывозіла медыкам абеды, «Пармезан» частаваў піцамі, «Тандыр» пірагамі, мясакамбінат перадаваў сваю прадукцыю. Бясплатна падкормлівае брыгады медыцынскай дапамогі «МакДональдс»: калі яны бачаць, што пад'язджае машына з крыжам на борце, — выдаюць на ўсю брыгаду бульбу фры, каву і піражкі. Крама «Green», што на вуліцы Астроўскага, рэгулярна робіць на сваю прадукцыю зніжкі ад 25 да 50 % для ўсіх медработнікаў — трэба толькі паказаць даведку з работы і пашпарт.

А нядаўна дзяўчына атрымала адчувальную прыбаўку да зарплаты за работу з «кавіднымі» пацыентамі. Кажа, што было вельмі прыемна глядзець у разліковы лісток. Але доўга думаць, на што патраціць грошы, не стала — цалкам аддала іх сваім бацькам на рамонт кватэры.



Аксана КАЗАКОВА заклікае беларусаў не выпрабоўваць свой імунітэт.

**Урач агульнай практыкі Цэнтральнай паліклінікі Магілёва Аксана КАЗАКОВА** ўжо трэці месяц працуе ў рэжыме павышанай небяспекі. Першы «кавідны» пацыент быў зусім нядаўна — у красавіку. Але пра яго дыягназ урач даведалася не адразу.

— Дапамога спатрэбілася жанчыне, якая хварэла на бранхіяльную астму, у яе пачалося абвастрэнне, — расказвае яна. — Выклік быў звычайны, і я хадзіла да яе ў звычайным касцюме, праўда, з маскай, у акулярах, пальчатках. А праз два дні стан жанчыны пагоршыўся, і яе шпіталізавалі. Хутка стала вядома, што ў яе COVID-19. Усяго на тым тыдні ў мяне адбылося 4 кантакты з такімі хворымі, але самаізаляцыя не спатрэбілася — мазок на COVID-19 быў адмоўны. Мы заўсёды ідзём як кантакты другога ўзроўню, таму што працуем у абароне.

Урачы паліклінікі сёння знаходзяцца ў «бруднай» і «чыстай» зонах па графіку. У «бруднай» прыём вядзецца выключна ў спецыяльнай экіпіроўцы.

— Там мы прымаем пацыентаў з тэмпературай, прыкметамі прастуды, — удакладняе Аксана Рыгораўна. — Цяпер нам прывезлі экспрэс-тэсты, і на 8-10-ы дзень захворвання зможам правяраць, ці хварэе чалавек на COVID-19: бярэш кроў з вены і праз пяць хвілін ведаеш. На ПЦР мы ўсіх агулам не адпраўляем, толькі па паказаннях.

Работа медыкаў заўсёды звязана з рызыкай. Працаваць даводзіцца з рознымі пацыентамі, у тым ліку хворымі на ВІЧ, гепатыт. Як пазбегнуць небяспекі заразіцца? Напрыклад, сёння людзі, каб не захварэць, вельмі шырока карыстаюцца народнымі сродкамі: прымаюць вітамін С, ядуць імбір і нават нюхаюць гарэлку — ёсць і такі ролік у інтэрнэце. Наконт гэтага Аксана Казакова заклікае не ісці на рызыку, бо шкоды арганізму можна прынесці больш, чым карысці. Пары гарэлкі могуць уздзейнічаць на ліпідную абалонку віруса, на гэтым грунтуецца дзеянне антысептыкаў, якімі мы апрацоўваем паверхні, — але гэта эфектыўна толькі да таго часу, пакуль вірус не ўкараніўся ў клетку. А вось імунітэт трэба ўмацоўваць. У гэтым дапамогуць прагулкі на свежым паветры, умераныя фізічныя нагрузкі, збалансаванае і рэгулярнае харчаванне, а таксама настрой. Але залішне выпрабоўваць свой імунітэт не трэба.

**«Наогул людзі рэагуюць на новую хваробу па-рознаму: у кагосьці спалох, у кагосьці слёзы, нехта сябе абвінавачвае у тым, што заразіўся, а вось у кантактаў першага ўзроўню часцей за ўсё бывае гнеў — злуюцца, што іх заразілі. Але хвароба не выбірае, нікога вінаваціць не трэба».**

— Сама лішні раз не выходжу з хаты, а калі трэба зайсці ў краму, надзяваю маску і пальчаткі, каб не падвяргаць людзей рызыцы, — кажа ўрач. — Да «кавідных» пацыентаў і кантактаў першага ўзроўню ходзім выключна ў супрацьчумных касцюмах, а проста на выклік — у масцы, пальчатках, са шчытком. Людзі вельмі добразычлівыя, спачуваюць нам.

Аксана Казакова прызнаецца, што шмат чаго давялося змяніць у жыцці. Асабліва балюча пераносіцца самаізаляцыя ад дзяцей, якім 5 і 12 гадоў. Яна з мужам не бачыла іх ужо з канца лютага. Дзеці жывуць зараз з бацькамі Аксаны і таксама сумуюць. А яшчэ давялося адмовіцца ад паездак, прагулак, паходаў. І вельмі хочацца ў адпачынак на мора.

За фактычна адпрацаваны ў шкодных умовах час жанчына атрымала даплату. Яна яшчэ не ведае, як ёй распарадзіцца. «Магчыма, куплю сабе потым якую-небудзь прыгожую сукенку і, калі ўсё скончыцца, пайду ў ёй у кавярню, — марыць Аксана.— Трэба ж гэта будзе неяк адзначыць».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіваў Ганны АЎЧЫННІКАВАЙ і Аксаны КАЗАКОВАЙ.**

# Святочны звон у Жыровіцах

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Як адзначаецца на сайце манастыра, афіцыйнае адкрыццё помніка — ён, дарэчы, выраблены таксама на сродкі мецэнатаў і дабрачынныя ахвяраванні — плануецца да дня памяці святога (гэты дзень адзначаецца 6 верасня. — **«Зв.»**), а ў падмурак скульптуры будзе закладзена капсула з зямлёй з лагера, у якім загінуў архімандрыт Серафім Жыровіцкі.

Выхадзец з простай сялянскай сям'і, ураджэнец вёскі Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Брэстчыны, айцец Серафім (у мірскім асяроддзі — Раман Шахмуць) стаў вядомы праз сваю місіянерскую дзейнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўленне раней зачыненых цэркваў і прыходаў, а таксама пастырскае апекаванне ў Мінску бальніцамі, інваліднымі дамамі і дзіцячымі прытулкамі. У 1944 годзе святар быў арыштаваны, абвінавачаны ў супрацоўніцтве з немцамі і высланы ў лагер у Горкаўскай вобласці (цяпер — Ніжагародская), адкуль ужо не вярнуўся — па афіцыйных звестках, памёр ад сардэчнай хваробы, а па ўспамінах аднадумцаў, прыняў пакутніцкую смерць... У 1999 годзе Свяшчэнны Сінод Беларускай Праваслаўнай Царквы далучыў архімандрыта Серафіма да ліку 23 святых новапакутнікаў зямлі беларускай, а праз год ён быў праслаўлены ў саборы новапакутнікаў і вызнаўцаў расійскіх XX стагоддзя.

...Нагадаем, Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр — не толькі адзін з галоўных цэнтраў беларускага праваслаўя, але і буйны архітэктурны ансамбль XVII—XVIII стагоддзяў. У манастырскі комплекс уваходзяць Успенскі сабор, Яўленская царква, Крыжаўздзвіжанская царква, зімовы Нікольскі храм, Георгіеўская царква, будынак Мінскай духоўнай семінарыі, званіца, брацкі корпус, жылыя і гаспадарчыя пабудовы, трапезная, царкоўныя крамы і манастырскі падворак у так званых Старых Жыровіцах — «Эдэмскі сад». А яшчэ Жыровіцкая абіцель — гэта ўнікальная бібліятэка і царкоўна-археалагічны музей Мінскай духоўнай семінарыі, які апавядае наведвальнікам гісторыю станаўлення найстарэйшай у нашай краіне багаслоўскай навучальнай установы, адлюстроўвае развіццё царкоўнага мастацтва, паказвае матэрыялы археалагічных раскопак, якія праводзіліся на тэрыторыі манастыра ў 2007 годзе, утрымлівае калекцыю рэдкіх рукапісных кніг і старадрукаў, сярод якіх «Апостал» Івана Фёдарава, рукапісная «Кніга аб веры» XVII стагоддзя, факсімільная копія Жыровіцкага Евангелля з аўтографам канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі і многія іншыя каштоўныя дакументы.

Менавіта сёння, 20 мая, вернікі ўшаноўваюць абраз Божай Маці Жыровіцкай, які прызналі цудадзейным і праваслаўная, і каталіцкая канфесія. Паводле звестак з розных крыніц ад XVI да XXI стагоддзя, якія насельнікі манастыра карпатліва збіраюць, людзі згадваюць звыш паўсотні выпадкаў цудоўнай дапамогі Маці Божай праз ікону. Тут і выздараўленне цяжкахворых, і дараванне магчымасці бясплодным парам стаць бацькамі, і вяртанне страчанай мовы або зроку, і захаванне іконы пры пажары, і выратаванне самой Жыровіцкай абіцелі падчас Вялікай Айчыннай вайны — падчас вызвалення гарадка ў ліпені 1944 года: як успамінаюць сведкі тых падзей, ніводная авіябомба і ніводны выпушчаны з танкаў снарад не трапілі ў манастырскія будынкі...

Звычайна на свята ў Жыровіцах збіраецца мноства паломнікаў з розных краін свету, таксама ў гэтыя дні праходзіць пад адкрытым небам традыцыйны музычна-літаратурны «Жыровіцкі фэст», аднак сёлета з-за складанай эпідэміялагічнай сітуацыі было прынятае рашэнне перанесці юбілейныя ўрачыстасці на пазнейшы тэрмін. Таму сёння ў манастыры пройдзе толькі закрытая святочная служба з удзелам намесніка, **архіепіскапа Навагрудскага і Слонімскага ГУРЫЯ** — ён ужо выпісаны са шпіталя і запісаў відэазварот з падзякай усім, асабліва ўрачам, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй, за падтрымку насельнікаў і навучэнцаў семінарыі, якія знаходзяцца ў самаізаляцыі ці на лячэнні ў шпіталях, за ўсе тыя добрыя справы, якія людзі з адкрытым сэрцам робяць у гэты няпросты час.

І тым не менш, няхай пакуль што ў дыстанцыйным фармаце, Беларусь адзначае вялікі юбілей — новымі кнігамі і фільмамі пра гісторыю манастыра, прысвечанымі знакавай даце навуковымі даследаваннямі і канферэнцыямі, мастацкімі і музейнымі праектамі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Мінскай духоўнай семінарыі.**

### Дасье «Звязды»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Жыровіцкі абраз Божай Маці – не толькі цудатворная святыня, якая ўваходзіць у спіс 100 самых значных праваслаўных ікон свету, але і мастацкі рарытэт, гісторыка-культурная каштоўнасць. Гэта самая маленькая сярод аналагічных ікон, памер пласціны яшмы з рэльефнай выявай Дзевы Марыі і маленькага Ісуса складае ўсяго 5,6 на 4,4 сантыметра.

У дыванах, асабліва з доўгім ворсам, збіраецца вялікая колькасць пылу, у якім заводзяцца пылавыя кляшчы — дэрматафагаідэсы. Харчуюцца мікраскапічныя паразіты адмерлымі лускавінкамі чалавечай скуры, якія асядаюць у дыванах. Праблема ў тым, што экскрэментаў за сваё жыццё гэтыя істоты выпрацоўваюць у 200 разоў больш за ўласную вагу! Таксічныя прадукты жыццядзейнасці трапляюць у паветра, якім мы дыхаем. Гэта выклікае чханне, кашаль, галавакружэнне і іншыя алергічныя рэакцыі, што асабліва небяспечна для дзяцей.

— Праз пастаянны кантакт з пылавымі кляшчамі можа знізіцца імунітэт і развіцца паўнавартасная алергія, — кажа Святлана Клімук. — Каб пазбавіцца ад кляшчоў і іх патомства, штодзённа праветрывайце памяшканні, у якіх ёсць дываны, рэгулярна выбівайце іх на вуліцы і пры магчымасці выкарыстоўвайце ультрафіялетавую лямпу.

### Цвіль

Яшчэ адзін вельмі непрыемны і небяспечны жыхар дывановых пакрыццяў — цвіль. Яна жыве ў памяшканнях з павышанай вільгаццю. Гэтаму грыбку дастаткова аднаго-двух дзён, каб завесціся ў сырым асяроддзі.

— З'яўленне цвілі не застанецца незаўважаным, бо яна мае непрыемны затхлы пах. Шматлікія споры трапляюць у паветра і разлятаюцца па кватэры, да таго ж дыхаць імі небяспечна для здароўя, бо гэта аслабляе імунную, таму пазбаўляцца ад яе варта неадкладна, — папярэджвае суразмоўца.

Пашкоджаны цвіллю дыван вынесіце на вуліцу і цвёрдай шчоткай выдаліце цвіль. Затым апрацуйце месца спецыяльным сродкам ад цвілі, які прадаецца ў магазінах бытавой хіміі. Пасля апрацоўкі старанна прамыйце дыван з абодвух бакоў і як след прасушыце, а пакой, дзе ён ляжаў, праветрывайце некалькі дзён, каб пазбавіцца ад спор, якія засталіся.

### Дывановыя скураеды

У дыванах могуць пасяліцца і іншыя насякомыя, напрыклад дывановыя жукі-скураеды. Звычайна яны трапляюць у нашы дамы з вуліцы, запаўзаюць летам праз адчыненыя вокны, ці гаспадары самі заносяць іх з рэчамі. Асабліва жукам падабаюцца футравыя і варсістыя вырабы. таксама яны селяцца ў мэблі і кнігах. Дывановыя скураеды вельмі жывучыя, яны выдатна адчуваюць сябе як у халодных вільготных памяшканнях кшталту падвалаў, так і ў цёплых сонечных гасцінных.

— У дыванах селяцца не толькі жукі, але і іх лічынкі. Менавіта яны і ўяўляюць найбольшую небяспеку. Яны харчуюцца вырабамі з шэрсці, а калі дабяруцца да шафы, то «паласуюцца» футрамі і скуранымі вырабамі, — тлумачыць медык. — Дывановыя скураеды небяспечныя і для людзей, яны пераносяць мноства шкодных мікраарганізмаў і яйкі глістоў, якімі пры ўкусе могуць заразіць чалавека.

Барацьба з дывановымі жукамі і іх лічынкамі ў хатніх умовах патрабуе шмат сіл. Давядзецца правесці дэзынфекцыю не толькі пашкоджанага дывана, але і ўсяго пакоя, бо лічынкі хутка распаўсюджваюцца і хаваюцца за плінтусамі, пад мэбляй і ў іншых цёмных месцах. Акрамя таго, дываны трэба будзе пыласосіць 1-2 разы на дзень. Замест інсектыцыдаў можна выкарыстоўваць раствор борнай кіслаты — яна не таксічная для людзей і хатняй жывёлы, але мае адбельваючы эфект і можа пакідаць сляды на цёмных рэчах і паверхнях.

### Хваробатворныя бактэрыі

— У дыванах нават пры рэгулярнай чыстцы пыласосам жыве вялікая колькасць хваробатворных бактэрый — ад кішэчнай палачкі і залацістага стафілакока да ўзбуджальнікаў пнеўманіі. На жаль, цалкам дэзынфіцыраваць дыван у хатніх умовах практычна немагчыма, нават калі вы выкарыстаеце бытавую хімію для ачысткі: яна проста не здольная пранікаць настолькі глыбока, каб знішчыць усе бактэрыі, — адзначае Святлана Клімук.

Каб у дыване не завяліся такія непрыемныя суседзі, неабходна рэгулярна яго даглядаць. Можаце скарыстацца хатнімі спосабамі чысткі, але гарантаваць поўную бяспеку яны не здольны, і насякомыя, цвіль і кляшчы будуць зноў вяртацца. Каб ніколі не сутыкацца з падобнымі непрыемнасцямі, рэкамендуецца раз на год здаваць свае дываны ў хімчыстку. Толькі прафесійныя сродкі здольны глыбока пранікнуць у дыван, пазбавіць яго ад пылу і бруду, спор грыбка, яек і лічынак насякомых, а таксама прадэзынфіцыраваць.

# ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

## Як не атруціцца курынымі яйкамі

**Курыныя яйкі могуць пацягнуць істотныя праблемы для здароўя, калі, напрыклад, іх няправільна захоўваюць. Можа дайсці да шпіталізацыі. Як не стаць ахвярай небяспечных бактэрый, якія могуць жыць на шкарлупіне і пад ёй? Чаму еўрапейскія ўрачы забараняюць мыць яйкі? І чаму ў адных магазінах яны захоўваюцца ў халадзільніках, а ў іншых — на звычайных цёплых стэлажах?**

### На што звяртаць увагу?

Як правіла, самыя вялікія яйкі на прылаўках прадаюцца са штампам «СО». Літара «С» азначае «Сталовыя», а літара «О» — «Адборныя». Іх нясуць дарослыя куры. Больш дробныя яйкі ад маладзейшых нясушак раздзяляюць на тры катэгорыі: С1 — 55-64,9 грама, С2 — 45-54,9 грама, С3 — 35-44,9 грама. Што датычыцца карысці, то ва ўсіх гэтых яек яна аднолькавая.Не мае значэння і колер шкарлупіны. Насычанасць колеру жаўтка — таксама неадназначны паказчык карыснасці.

Што сапраўды важна — гэта дата вырабу яек. Найлепшыя яйкі — тыя, якім менш сямі дзён: яны лічацца дыетычнымі. А далей бялок становіцца ўсё больш вадкі з-за разбурэння авамуцыну — пратэіну, які надае пругкасць. А ў жаўтку распадаюцца тлушчы і карысныя вітаміны, асабліва калі захоўваць яйкі няправільна.

### Як захоўваць правільна?

У магазінах яйкі ляжаць часам у халадзільніку, а часам проста на паліцах. Як жа правільна іх захоўваць?

Блытаніна ўзнікла таму, што эксперты з ЗША і Еўрасаюза не змаглі прыйсці да адзінага меркавання. У амерыканскія бальніцы штогод паступае мільён чалавек з сальманелёзам. Таму ўсе фермы абавязаны мыць яйкі і апрацоўваць іх дыяксідам хлору, а магазіны і грамадзяне павінны трымаць іх у халадзільніку пры тэмпературы не вышэй за +4 градусы, каб сальманелы, якія трапілі пад шкарлупіну, у холадзе не размнажаліся. Калі іх мала, гэта не страшна — імунітэт справіцца.

А ў Еўропе іншы падыход. Лічыцца, што падчас мыцця змываецца асаблівая надшкарлупінная абалонка — кутыкула, якая перашкаджае пападанню ў яйка хваробатворных бактэрый, у тым ліку і сальманелы. На Захадзе кур вакцынуюць, таму не патрабуецца захоўванне яек пры нізкіх тэмпературах.

У нас дапускаецца захоўванне яек без халадзільніка, але не даўжэй за 25 дзён. А ў холадзе іх можна трымаць аж тры месяцы. Праўда, у дзверцы халадзільніка яны столькі не пражывуць — ім лепш у глыбіні на паліцы, дзе тэмпература стабільная.

### Ці мыць перад гатаваннем?

Дзесьці настойваюць на старанным мыцці пад праточнай вадой, каб змыць сальманелы. У Еўропе, Аўстраліі і ЗША просяць гэтага не рабіць ні з яйкамі, ні з тушкамі курэй. Бо сальманелу не бяруць ні мыйныя сродкі, ні глыбокая замарозка — толькі высокія тэмпературы. Вадой нічога асабліва не змыеш, толькі распырскаеш бактэрыі па ўсёй кухні — і на чысты посуд, і на іншыя прадукты, і на адзенне. Таму перад гатаваннем яйкі лепш проста акуратна разбіць,а потым памыць рукі, нож і ўсё, да чаго датыкалася шкарлупіна.



### Ці трэба цалкам праварваць ці прасмажваць, каб не рызыкаваць?

Каб гарантавана абясшкодзіць яечню, смажыць яе варта 10 хвілін, прычым з двух бакоў. Але наўрад ці хто стане так рабіць. У той жа час даследаванні паказваюць, што ад доўгага гатавання яйкі трацяць свае карысныя ўласцівасці і вітаміны. Таму дыетолагі не супраць яек усмятку.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Была вайна

# «Страшна чуць ад асобных «герояў», што яны гатовыя ўсё паўтарыць...»

**Сённяшняя моладзь ведае пра вайну толькі з фільмаў, кніг ды ўспамінаў, дзе самыя каштоўныя — ад тых, хто яе перажыў.**



Мая мама расказвала, што калі пачалася вайна, хлопцы з іх вёскі стварылі падпольную арганізацыю. Пачыналі з таго, што па ўсёй акрузе збіралі звесткі аб колькасці варожай тэхнікі, аб перамяшчэннях немцаў і перадавалі партызанам.

У самой вёсцы, як згадвала мама, немцаў не было — хіба што наездамі, затое хапала паліцаяў, якія стараліся выслужыцца перад новымі гаспадарамі. І таму, калі з часам падпольшчыкі пайшлі ў партызаны, гэтыя паслугачы як з ланцуга сарваліся: з кожнай такой вось сям'і некага забіралі для адпраўкі ў Нямеччыну. Колькі ж слёз тады пралілося! З мамай ды іншымі развітваліся назаўсёды, бо не чакалі, што вернуцца.

Усіх адабраных, адарваных ад родных, павезлі спачатку ў Казлоўшчыну, затым у Слонім, дзе, як тую скаціну, пазганялі ў вагоны для перавозкі жывёлы. Тым, хто сядзеў ля сцяны, дыхаць было хоць трохі лягчэй. Ды і нешта ўбачыць можна было — праз шчыліну.

Спыняўся цягнік рэдка. Людзей кармілі, абы не памерлі з голаду. Не хапала нават вады. А ўрэшце выгрузілі каля нейкага нямецкага мястэчка і далей пагналі пешшу. Пасялілі — рускіх, украінцаў, беларусаў (у кожнага з'явіўся свой парадкавы нумар) — у бараку за калючым дротам...

Працавала мама, як і яе сябры па няшчасці, на ваенным заводзе, пад зямлёй, у некалькі змен па дванаццаць гадзін. І днём хоць адчыняліся дзверы, таму дыхалася лягчэй, а вось ноччу ўсё было зачынена з мэтай маскіроўкі...

Сама ж праца была арганізавана так: нявольнікі сядзелі за доўгім канвеерам, па якім «паўзлі» снарады (у іх насыпалася ўзрыўчатка) і гранаты (там да шоўкавых нітак у ручках прымацоўвалася, як мама казала, невялікая пацерка, неабходная для таго, каб граната ўзарвалася).

За работай і рабочымі вельмі пільна сачылі пажылыя немцы і немкі.

Але нават у такіх умовах дзяўчаты прымудраліся шкодзіць ворагам: у снарады недасыпалі пораху, ручкі гранат проста закручвалі, а тыя «пацеркі» хавалі ў кішэнях, а пасля кідалі ва ўнітаз.

Гэта было вельмі небяспечна, бо нявольнікаў білі ўжо за тое, што не спадабаўся позірк, за ўсмешку, за малейшую затрымку на канвееры... Усіх там называлі «русішэ швайнэ». Да таго ж зімой снарады паступалі такімі халоднымі, што на іх быў іней.

Мама тады прымарозіла пальцы і пасля ўсё жыццё баялася нават невялікага холаду ў рукі.

Кармілі ў лагеры дрэнна: на суткі давалі міску баланды і кавалачак хлеба. У нядзелю не кармілі зусім. Тады выручалі хіба тыя кавалачкі, якія нявольнікі прыхоўвалі ў набітыя стружкамі матрасы, нават у брудную бялізну.

Мама ўспамінала, як адзін бюргер выкінуў бочку сапсаваных селядцоў. І хоць пахлі яны, мякка кажучы, дрэнна, на гэта ніхто не зважаў — ежа!..

А неяк перад Вялікаднем нявольнікі ўбачылі, што на харчовым складзе выбіта акно. Зазірнулі ў яго і ўбачылі кучу гародніны. Адна дзяўчына перагнулася да яе цераз «падаконне» (іншыя трымалі яе за ногі) і стала вонкі выкідваць буракі. Такім чынам назаўтра ў палонных быў Вялікдзень!

...Вайна прыбліжалася да Германіі. З усходу наступалі савецкія салдаты, з захаду — войскі саюзнікаў. Часта грымелі выбухі, выла сірэна, якая папярэджвала аб паветраным налёце. Немцы тады кідалі работу і хаваліся ў бункеры, а нашы — з надзеяй пазіралі ў неба...

Неяк пасля чарговай начной бамбёжкі яны не пачулі прывычнай сірэны, якая збірала іх на работу, не ўбачылі немцаў. Самі пайшлі туды, дзе ўчора яшчэ быў завод, а цяпер — хіба вялізныя ямы... Усе зразумелі, што прыйшла свабода: абдымаліся, смяяліся, плакалі ад шчасця, што дажылі!..

Хутка да лагера на машынах пад'ехалі салдаты ў незнаёмай форме. Яны таксама весяліліся, пакрысе, каб не пашкодзіла, давалі нявольнікам ежу...

Праз нейкі час іх перавезлі ў перасыльнае месца збору, адтуль — на машынах — на Радзіму.

...Цяпер здараецца часам пачуць ад асобных «герояў», што яны гатовыя ваяваць і яшчэ раз усё паўтарыць.

Не, я ўпэўнена, толькі не гэта.

**Людміла ЛАПАТА,**
**настаўніца гісторыі,**
*Дзятлаўскі раён.*

На сваім месцы

# КЛАСНЫЯ КІРАЎНІКІ ПАТРЭБНЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў ШКОЛАХ

**І сапраўды: няма часам парадку на асобных прадпрыемствах, ва ўстановах ды арганізацыях. А потым прыходзіць новы кіраўнік і...**

Прыклад з жыцця? Калі ласка.

Дарожна-будаўнічае ўпраўленне ў нашым райцэнтры доўгі час існавала чыста намінальна — не ладзіліся там справы. Колькасць працуючых — 36 чалавек, матэрыяльная база — амаль на нулі, гаражы і майстэрня — у прыстасаваных памяшканнях, кантора — у будынку былога клуба...

Памятаю, як мой былы вучань Валодзя Колесень пры сустрэчы «пахваліўся»: маўляў, прапануюць яму ўзначаліць гэту арганізацыю.

З аднаго боку, я жахнулася: ці справіцца, ці пацягне гэты малады чалавек воз найцяжэйшых праблем? (ДБУ на той час было самай адсталай арганізацыяй у раёне...) А з іншага — я ведала гэтага чалавека з самага маленства. Рос ён у шматдзетнай сялянскай сям'і, з хутара за некалькі вёрстаў бегаў у нашу Капланецкую школу, дзе вылучаўся рэдкай акуратнасцю і дысцыплінай.

Пасля службы ў войску хлопец працаваў шафёрам, механікам па транспарце торфабрыкетнага завода, галоўным механікам, завочна вучыўся ў дарожна-будаўнічым тэхнікуме, у тэхналагічным інстытуце... Разумны, працавіты, адукаваны, ён павінен быў справіцца.

З першых дзён, наколькі ведаю, малады кіраўнік вельмі сур'ёзна ўзяўся за справу: падабраў каманду аднадумцаў, наладзіў дысцыпліну, пачаў будаваць асфальтавыя заводы ў Васілеўшчыне, потым у Марціянаўцы, Градзянцы. Наяўнасць будаўнічых матэрыялаў дазваляла нарошчваць аб'ёмы работ, уводзіць у эксплуатацыю дарогі мясцовага значэння. Аднак асноўным аб'ектам, можна сказаць, тварам арганізацыі сталі 50 кіламетраў аўтатрасы Мінск—Магілёў, па якой заўсёды прыемна ехаць.

...А паралельна з развіццём матэрыяльнай базы ішло сацыяльнае: сем'і дарожнікаў адсвяткавалі наваселле ў 24-кватэрным доме, потым — у 10 аднакватэрных. У прадпрыемства з'явілася свая база для сапраўднага адпачынку — з магчымасцю рыбалкі, з лазняй, більярдам...

Аднак найперш — аб'ёмы работ і заробкі. Яны цяпер складаюць у сярэднім больш за 1100 рублёў у месяц, а таму не дзіва, што трымаюцца людзі за сваё ДБУ-31, ганарацца, што яго кіраўнік адзначаны званнем «Ганаровы дарожнік» і медалём «За працоўныя заслугі».

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

Чалавек — чалавеку

# ПОМНІК ЛЮБОВІ І ВЕРНАСЦІ

**Сталічны Купалаўскі парк, які некалі паўстаў на месцы разбуранага вайной жылога квартала, я ведаю да драбніц. І ўсё ж, праходзячы па алеях, час ад часу раблю нейкія адкрыцці.**

...Маімі добрымі суседзямі былі сужэнцы Рыма і Уладзіслаў. Яна — карэнная масквічка, дачка «ворага народа». І тым не менш, нягледзячы на гэта, здолела паступіць у інстытут, старалася атрымаць вышэйшую адукацыю...

У Беларусь яна прыязджала на практыку і тады ж, як казала, назаўжды ўлюбілася ў гэты край: менавіта сюды папрасілася на работу пры размеркаванні.

Уладзя на той час быў студэнтам політэхнічнага інстытута, на суботніках прыбіраў тэрыторыю будучага Купалаўскага парка, садзіў дрэвы. Такім чынам яны абое апынуліся ў адным месцы і ў адзін час — пазнаёміліся, што, дарэчы, Рыму зусім не здзівіла, бо яе — прыгожую, усмешлівую, добразычлівую — хлопцы не абміналі сваёй увагай. Але ж варта было пачуць, што яе бацька «вораг народа», — дзе што дзявалася: кавалеры палохаліся і адразу ж адступалі ўбок.

Хіба Уладзя нічога не збаяўся...

Яны пажаніліся і вельмі добра, дружна жылі, працавалі, гадавалі дзяцей, а потым...

Ужо будучы на пенсіі, Рыма цяжка захварэла. І тады яе муж пакінуў досыць высокую і адказную пасаду — стаў даглядаць жонку.

...У памяці, як вазіў яе на працэдуры. Разам з некім з дзяцей, на калясцы, хворую спускалі на першы паверх, з ліфта на насілках выносілі да «хуткай», дзе яна адразу ж клалася на бок, крыху падбірала пад сябе ногі, сухенькія рукі клала пад галаву. Гэтая сцэна паўтаралася кожны раз.

Дык вось, калі праз цэнтральны ўваход зайсці ў Купалаўскі парк і збочыць улева, то проста спынішся перад адной авангарднай скульптурай. Называецца яна «Дзіця ў калысцы». Гэта — для ўсіх. Для мяне ж там... Рыма, якая ляжыць, падабраўшы ногі і паклаўшы рукі ля твару.

А над ёю, захінаючы ад непагоды, узвышаюцца шаты дрэў. Дрэў, якія некалі, у далёкія гады маладосці, пасадзіў яе Уладзя.

**А. Балошка,**
*г. Мінск.*

Як ёсць, так ёсць

# ЗАСТАЎСЯ ХІБА АБЕЛІСК

**Сваякі Якуба Якаўлевіча Грынчука звярнуліся некалі ў ваенны архіў з просьбай паведаміць, якія ўрадавыя ўзнагароды меў загінулы...**

**Адказ з Падольска прыйшоў досыць хутка. Пра ўзнагароды ў ім, праўда, ні слова не было, але ж паведамлялася, што загінуў сваяк 7 студзеня 1945 года, што пахаваны ў вёсцы Янова Рыпінскага павета Варшаўскага ваяводства Польшчы.**

Нарадзіўся Якуб Грынчук у вёсцы Грынкі на Слонімшчыне, вучыўся на слесара ў школе фабрычна-заводскага навучання, а калі немцы занялі Беларусь, стаў партызанскім сувязным: працуючы на чыгуначным пераездзе, адсочваў перамяшчэнні варожых эшалонаў, аж пакуль камандаванне не паклікала яго ў атрад...

Ужо адтуль Якуб Грынчук добраахвотна падаўся ў разведчыкі, стаў дапамагаць Чырвонай Арміі і польскім сябрам у вызваленні Польшчы.

...Група іх 25 жніўня 1944 года ўдала прызямлілася і стала дзейнічаць сумесна з канспірацыйнай арганізацыяй Рыпінскага павета, а 7 студзеня 1945-га Якуб Грынчук нарваўся на варожую засаду. Яго акружылі і тады, падпусціўшы немцаў бліжэй, ён узарваў гранату.

У 1973 годзе сваякі разведчыка пабывалі на месцы гібелі Якуба Грынчука. Сустракалі слонімцаў кветкамі і гарачымі абдымкамі. На ўрачыстасці прысутнічалі прадстаўнікі партыйных арганізацый, мясцовых улад, Генеральны консул СССР у Гданьску Пётр Шарыкін, многа людзей. Яноўскай школе тады прысвоілі імя разведчыка, адкрылі мемарыяльную шыльду.

Цэлы тыдзень сваякі героя гасцілі ў Польшчы: пазнаёміліся з павятовым Рыпінам, пабывалі ў мясцовай сельскай гаспадарцы, былі жаданымі гасцямі ў былога сланімчаніна Станіслава Засімовіча, які працаваў павятовым школьным інспектарам, атрымалі шмат памятных падарункаў, у тым ліку — фотаальбом, прысвечаны памяці разведчыка.

...Якраз яго мне паказала нядаўна Клаўдзія Канстанцінаўна Каральчук, пляменніца Якуба Грынчука. А заадно спытала: «Цікава, ці захоўваецца цяпер памяць пра дзядзьку?»

Гэтае пытанне я адрасаваў гісторыкам з Польшчы і пачуў, што школа ў Янове ўжо не носіць імя разведчыка, няма на ёй і мемарыяльнай шыльды. Застаўся толькі абеліск.



Якуб Грынчук.

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
*г. Слонім.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У канцы зімы восемдзесят дзявятага года, калі на азёрах яшчэ трымаўся тоўсты лёд, я накіраваўся ў Гарадок — самы паўночны раённы цэнтр. Я планаваў здымаць вэтэрана — аматара зімовай рыбалкі на адным з навакольных азёр. Сапраўды, той раз Іван Дарошчанка, як запраўскі рыбак, быў апрануты ў цёплую ватоўку і валёнкі, тузаў мармышкай каля лункі — ён лавіў акунёў, а я тым часам рабіў фотаздымкі. А потым мы пайшлі ў цёплую, утульную кватэру ветэрана і пад чаёк прадоўжылі шчырую размову.

— Страх на вайне адчуваў пастаянна. Уяві сабе, тры-чатыры дні — і палка як не было — згадваў франтавік. — Але ж я набываў вопыт — ведаў, дзе ўзарвецца снарад. Ды і шэнціла, як без гэтага!

У разведвальным падраздзяленні яго называлі «акопным д'яблам», бо воін бясстрашна ўрываўся ў варожыя акопы, кідаўся ў рукапашную.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

# Іваны-разведчыкі

**«Звязда» працягвае праект «Дарогамі Славы», які запусціла сумесна з Музеем гісторыі Узброеных Сіл. У межах праекта мы апавядаем пра ваенны шлях поўных кавалераў ордэна Славы, якія нарадзіліся ў Беларусі або звязалі з ёй свой далейшы лёс.**

**Заклікаем вас, паважаныя чытачы: калі сярод вашых родных і блізкіх хтосьці або быў поўным кавалерам ордэна Славы, або асабіста іх ведаў і захаваў успаміны ці фотаздымкі, то дзяліцеся вашымі гісторыямі з намі! Наш адрас — вуліца Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013. Адрас электроннай пошты — info@zviazda.by. Ніводны ліст не застанецца без увагі!**

**Сёння мы згадваем жыццёвы шлях двух разведчыкаў. Яны цёзкі — Іван Шмея і Іван Дарошчанка. Родам яны з Віцебска і размешчанага побач з абласным цэнтрам Гарадоцкага раёна...**





## Іван ШМЕЯ

Ён нарадзіўся 29 чэрвеня 1922 года ў Віцебску. Рос у сям'і шматдзетнай — акрамя Івана, бацькі выхоўвалі яшчэ шасцярых малых. Дзесьці ў 1930-я гады яго бацьку, Сцяпана Шмею, які быў служачым, перавялі на тагачаснае беларуска-польскае памежжа — у горад Дзяржынск. Там Іван скончыў дзесяцігадовую школу, пасля працаваў у арцелі.

Размеранае жыццё перапыніла вайна. Каб дакладна трапіць у войска, Іван Шмея змяніў дату нараджэння — прыбавіў сабе адзін год. Мэта спраўдзілася — юнака прызвалі. І адразу ж ён трапіў у гушчар баявых дзеянняў. Ваяваў на Заходнім, 2-м і 3-м Беларускім франтах. Стаў камандзірам аддзялення разведкі, зарабіў лычкі малодшага сяржанта. Служыў у 366-м стралковым палку 126-й стралковай дывізіі. Асабліва ж хлопец адзначыўся ў баях за Літву і Усходнюю Прусію.

Да ордэна Славы III ступені малодшы сяржант Шмея ішоў больш за тры гады. А пасля здзейсніў тры вельмі каштоўныя аперацыі літаральна за два тыдні ў кастрычніку 1944 года. 6 кастрычніка ён на чале разведвальнай групы здабываў інфармацыю аб пазіцыях нямецкіх войскаў на паўночны захад ад Шяўляя. Група наткнулася на засаду. Пачаўся бой. Разведчыкі знішчылі некалькі ворагаў. Праз некалькі дзён Іван Шмея асабіста падарваў гранатамі дзве нямецкія аўтамашыны. А ў якасці трафея група забрала з сабой кулямёт. Яшчэ праз некалькі дзён ён вярнуўся з задання са звесткамі пра сістэму нямецкай абароны блізу аднаго з невялікіх гарадоў.

...У студзені 1945 года баі ішлі ўжо на тэрыторыі Усходняй Прусіі. Малодшы сяржант Іван Шмея разам з групай разведчыкаў пранік у размяшчэнне гітлераўцаў, дзе адкрыў шквальны агонь. 11 немцаў так і засталіся там назаўжды. Іх камандзір і рэшта тых, хто застаўся ў жывых, здаліся ў палон. Камандаванне арміі адзначыла гэты ўчынак ордэнам Славы II ступені.

Зеніт славы для Івана Шмеі надышоў у красавіку 1945-га, калі савецкія войскі штурмавалі Кёнігсберг. Наш герой ужо атрымаў вайсковае званне старшыны, пры гэтым ён па-ранейшаму камандаваў аддзяленнем узвода пешай разведкі. Яго група ў адну веснавую ноч здзейсніла вельмі дзёрзкі рэйд у тыл ворага. Вынікам гэтага сталі два знішчаныя кулямётныя разлікі, шэсць забітых аўтаматчыкаў. Назад разведчыкі вярнуліся цяжка нагрувашчаныя. «Улоў» атрымаўся немалы: 21 аўтамат і 30 вінтовак, а таксама 42 палонныя немцы. І, што вельмі каштоўна, быў адбіты склад з харчаваннем.

**Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў за гэты подзвіг Івана Шмею ордэнам Славы I ступені неўзабаве пасля заканчэння баявых дзеянняў — 29 чэрвеня 1945 года.**

Іван Сцяпанавіч Шмея дэмабілізаваўся з войска праз год, у 1946-м. Вярнуўся дадому ў Дзяржынск. Атрымаў інжынерную адукацыю, пасля ўладкаваўся на адзін з мясцовых заводаў, затым перайшоў у паляўнічую гаспадарку. Ён удзельнічаў у Парадзе Перамогі 1985-га года, стаў адным з герояў фільма Канстанціна Сіманава «Ішоў салдат».

Іван Шмея памёр у студзені 1998 года. Памяць пра яго жывая ў Дзяржынску — на Алеі Герояў усталяваны адмысловы знак. Адна з вуліц горада названа ў яго гонар.

## Іван ДАРОШЧАНКА

Жыццёвы шлях нашага другога героя пачаўся 5 мая 1922 года. Рос ён у сялянскай сям'і ў вёсцы Дубраўка Гарадоцкага раёна Віцебшчыны. Скончыўшы сем класаў, пайшоў працаваць. Вайна заспела Івана Васілевіча, калі ён быў забойшчыкам на адной з вугальных шахтаў у Данбасе. Але пад акупацыю трапіў ужо ў роднай вёсцы. Там і вымушаны быў застацца. Праўда, ненадоўга — улетку 1942-га Іван сышоў у лес, дзе далучыўся да Калінінскай партызанскай брыгады.

У Чырвоную Армію ён быў прызваны ў красавіку 1944 года. Яго накіравалі ў 14-ы стралковы полк 72-й стралковай дывізіі. Але за плячыма хлопца былі два гады партызанства, ён ужо меў досвед паспяховай дыверсійнай работы. Таму залічылі Івана Дарошчанку ва ўзвод разведкі. З ім і была звязана далейшая служба юнака: спачатку ён ваяваў на Ленінградскім, а пасля — на 1-м Украінскім фронце.

...Чэрвень 1944 года адзначыўся зацятымі баямі ў прыгарадзе Ленінграда — пасёлку Белавостраў, які цяпер уваходзіць у склад горада Сестрарэцк. Побач з ім лінія фронту знаходзілася яшчэ з верасня 1941 года. Менавіта адсюль улетку 1944-га, калі была прарвана блакада Ленінграда, савецкія войскі перайшлі ў масіраванае контрнаступленне. Фінскія лініі абароны ламаліся адна за другой. Падчас фарсіравання ракі Сястра сяржант Дарошчанка разам са сваёй групай захопу знайшоў тры варожыя агнявыя пункты, якія неўзабаве паспяхова «накрыла» савецкая палкавая артылерыя. А назад вайскоўцы вярнуліся з «языком». 2 ліпеня 1944 года Іван Дарошчанка быў узнагароджаны за гэтую бліскучую аперацыю ордэнам Славы III ступені. Высокую ўзнагароду яму ўручылі проста на полі боя.

У пачатку 1945 года 72-я стралковая дывізія была перакінута на 1-ы Украінскі фронт. Там яна вяла баі за вызваленне ад немцаў Польшчы. Сяржант Дарошчанка на той момант даслужыўся ўжо да памочніка камандзіра ўзвода. І вось пад горадам Ныса, блізу граніцы з тагачаснай Чэхаславакіяй, 24 сакавіка група пад камандаваннем Івана Дарошчанкі захапіла легкавы аўтамабіль і гітлераўскага афіцэра. Да таго на яе рахунку было яшчэ некалькі прыведзеных у савецкае размяшчэнне «языкоў». Камандаванне арміі ўзнагародзіла нашага героя за гэты ўчынак ордэнам Славы II ступені.

Упартае супраціўленне немцаў у тых мясцінах працягвалася і ў маі 1945-га. 4 мая падчас баёў за адну з вёсак старшы сяржант Іван Дарошчанка разам з групай разведчыкаў знішчыў звыш дзесяці гітлераўцаў. Яшчэ сем здаліся ў палон, сярод іх былі тры афіцэры.

**Гэта і стала падставай для таго, каб Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ аб узнагароджанні Івана Дарошчанкі ордэнам Славы I ступені. Поўным кавалерам ён стаў 27 чэрвеня 1945 года — праз тры дні пасля ўдзелу ў славутым Парадзе Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве.**

Пасляваенны лёс Івана Дарошчанкі склаўся няпроста. На родную Гарадоччыну ён вярнуўся толькі ў канцы 1970-х гадоў. Некаторы час працаваў у саўгасе «Заазерскі». Памёр ён 28 жніўня 2002 года. Апошні спачын старшы сяржант Дарошчанка знайшоў на могілках пасёлка Езярышча. Імя Івана Дарошчанкі носіць Гарадоцкі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж сельскагаспадарчай вытворчасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Анатоль КЛЯШЧУК *(фота).***

75-годдзе Вялікай Перамогі

# ДЗЕВЯЦЬ ІМГНЕННЯЎ ВАЙНЫ

## Судэксперты Магілёўскай вобласці згадалі ваеннае мінулае сваіх гераічных дзядоў

**Паглядзець на вайну вачамі продкаў вырашылі супрацоўнікі і грамадзянскі персанал упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці і яго тэрытарыяльных падраздзяленняў. Разглядаючы пажоўклыя ад часу фота зусім яшчэ маладых салдат і камандзіраў, яны пазнавалі ў іх сваіх таварышаў па рабоце і, здаецца, бачылі іх зусім з іншага боку.**



— Ідэю з задавальненнем падхапілі, і той матэрыял, што ўжо назапашаны, цяпер актыўна папулярызуецца, — кажа ініцыятар праекта «Героям прысвячаецца» **галоўны спецыяліст упраўлення па рабоце са СМІ Ірына РАЧКОЎСКАЯ.** — Сямейныя гісторыі аказаліся цікавымі не толькі для нашых супрацоўнікаў. Дачка **галоўнага спецыяліста ўпраўлення каардынацыі службовай дзейнасці Вольгі Часлаўскай** стала ўдзельніцай тэлемарафона канала «Беларусь 4. Магілёў» «Шляхі Перамогі». Яна расказала з экрана, як змагаўся яе прадзед Анатоль Міхайлавіч Сяньkоўскі. Ён быў партызанам, пэўны час камандаваў узводам атрада 3-га батальёна брыгады Кірылава. За адвагу і мужнасць быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. У мірны час ажыццявіў сваю мару і, нягледзячы на інваліднасць, стаў першакласным машыністам. У 1971 годзе яго поспехі ў працы былі адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Пакуль сабрана дзевяць гісторый, дзевяць прыкладаў мужнасці, дзевяць імгненняў вайны. Ірына запісала асобна кожны з гэтых аповедаў. Цалкам іх можна прачытаць на сайце Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.

— Сёлета адзначаецца 75-я гадавіна Перамогі, і было немагчыма застацца ўбаку, тым больш што вайна закранула кожную сям'ю і ў кожнага нашага супрацоўніка ёсць свая сямейная ваенная гісторыя. З гадамі памяць сцірае факты, а хочацца захаваць іх для нашчадкаў, — кажа яна. — Мы разам зачытвалі гэтыя гісторыі, абмяркоўвалі іх. Высвятлялася, што чыесьці дзядулі ваявалі ў адным або суседніх партызанскіх атрадах. Гэта было сапраўднае адкрыццё. Некаторыя прыносілі кнігі з успамінамі відавочцаў, а там нехта знаходзіў прозвішчы і сваіх продкаў. Калегі абменьваліся інфармацыяй, нешта пазначалі для сябе. **Начальнік упраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці палкоўнік юстыцыі Яраслаў ФЕДАРЫНЧЫК** прызнаўся, што яму было цікава чытаць пра дзядуляў сваіх супрацоўнікаў і праводзіць паралелі. Некаторыя — нават знешне — амаль копія сваіх продкаў. Мы сталі больш ведаць адно пра аднаго, пра нашы сем'і. І гэта вельмі важна, каб было адчуванне агульнасці, сяброўскага пляча, а таксама таго, што і мы маем прамое дачыненне да Вялікай Перамогі.

**Дзед начальніка ўпраўлення фінансаў і тылу Паўла Мышкоўскага Уладзімір Архіпавіч Іваноў** ваяваў у складзе 600-га партызанскага атрада ў Бялыніцкім раёне. Доўгі час гэта была адзіная інфармацыя, вядомая ўнуку. Але аднойчы падчас расследавання чарговай крымінальнай справы ён, яшчэ калі быў міліцыянерам, пазнаёміўся з чалавекам, які ведаў дзеда. Высветлілася, што Уладзімір Архіпавіч быў камандзірам разведроты і фашысты абяцалі за яго галаву вялікую суму грошай, якіх хапіла б на карову. Гэтыя звесткі пацвердзіліся ў Нацыянальным архіве. Доказам стала і публікацыя ў газеце «За камуністычную працу» 1970-х гадоў, якую знайшоў у бібліятэцы сын Паўла Мышкоўскага. У верасні 1943 года партызаны штурмам бралі Бялынічы, і Уладзімір Іваноў знішчыў у баі дзве машыны і каля дваццаці гітлераўцаў. Нагогул за час вайны мужны партызан падарваў пяць эшалонаў і ліквідаваў вялікую колькасць фашыстаў. За свае подзвігі ён быў ушанаваны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі» і «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

**Дзядуля начальніка аддзела судова-гісталагічных экспертыз упраўлення Наталлі Карманавай Павел Канстанцінавіч Патапаў** у 1943 годзе ў складзе трэцяга атрада партызанскага палка займаўся дыверсійнай дзейнасцю на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. А з чэрвеня 1944 года ён ужо ваяваў у дзеючай арміі ў якасці сувязіста-тэлефаніста 882-й стралковай роты — наводзіў і выпраўляў лініі сувязі паміж штабам палка і стралковымі батальёнамі. У раёне плацдарма ракі Нараў ён 30 разоў аднаўляў пад мінамётным дажджом сувязь камандавання з батальёнамі, за што атрымаў медаль «За адвагу». Нашчадкі беражліва захоўваюць дакументы і шматлікія ўзнагароды героя, сярод якіх ордэны Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені, медалі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». За вызваленне польскіх гарадоў Астраленка і Аславец Павел Патапаў атрымаў падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

**Іван Іванавіч Рудакоўскі, дзед супрацоўніка ДКСЭ Максіма Ласякова,** нават прыпісаў сабе паўгода, каб трапіць на фронт. Ваяваў мінамётчыкам 771-га стралковага палка 137-й стралковай дывізіі 48-й арміі 2-га Беларускага фронту. Аднойчы пры наступленні Чырвонай Арміі ён абясшкодзіў нямецкі дот, здолеўшы непрыкметна падпаўзці да яго і закінуць гранату ў амбразуру. Баявы шлях ветэрана адзначаны ордэнамі Айчыннай вайны II і I ступеняў, медалямі «За баявыя заслугі» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».

У **начальніка ўпраўлення спецыяльных экспертыз Ігара Чэрствага** шмат франтавікоў і па мацярынскай, і па бацькоўскай лініі. **Дзед Аляксей Гаўрылавіч Лісіцын** прайшоў усю вайну ад пачатку да канца, удзельнічаў у кровапралітных баях на Волхаўскім фронце, пры вызваленні Ноўгарада. За гераізм у баях на тэрыторыі Прыбалтыкі быў узнагароджаны медалём «За адвагу», а за баі па вызваленні Чэхіі атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Сярод яго ўзнагарод таксама ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў», а таксама дзве падзякі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

**Дзед старшага эксперта Бабруйскага міжраённага аддзела ДКСЭ Дзяніса Гаваракі — Георгій Уладзіміравіч Гаварака** — да таго як трапіў у дзеючую армію, паспеў павяваць у партызанах. Чатыры разы быў ранены ў баях, за свае подзвігі двойчы ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны II і I ступеняў і медалём «За адвагу».

**Начальнік Касцюковіцкага міжраённага аддзела ДКСЭ Арцём Стажкоў** ганарыцца адначасова і дзедам, і прадзедам. Прадзед Мікіта Макаравіч Стажкоў спачатку таксама партызаніў, а потым ваяваў у дзеючай арміі бранябойшчыкам. У адным з баёў у чэрвені 1944-га вынес з поля бою параненага камандзіра. За свае дзеянні атрымаў медаль «За адвагу». Але да Перамогі не дажыў — загінуў у студзені 1945-га. Затое **дзед, Аляксей Аляксандравіч Гараінаў,** дайшоў да Берліна. У студзені 1945 года пры выкананні баявога задання па дастаўцы абсталявання для сувязі старшага лейтэнанта Гараінава параніла. Але ён адмовіўся ад шпіталізацыі і працягваў камандаваць сваім падраздзяленнем. За гэты подзвіг ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Сярод баявых узнагарод Аляксея Гараінава таксама медалі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» і «За баявыя заслугі».

А вось дзядуля і бабуля **галоўнага спецыяліста ўпраўлення каардынацыі службовай дзейнасці Алены Гарчак** нават сустрэліся на вайне. Танкавая дывізія, у якой служыў Іван Балуеў, трапіла падчас абаронча баёў у Магілёўскі кацёл. На акупаванай тэрыторыі танкіст далучыўся да атрада партызан Канстанціна Белавусава. Менавіта там ён і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Марыяй Куліковай — яна служыла сувязной. Іван Балуеў за свае баявыя подзвігі ўшанаваны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, а таксама медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Жонка яго, дарэчы, таксама атрымала ўзнагароду — ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Ёсць кім ганарыцца і **медыцынскаму рэгістратару сектара судова-псіхіятрычных экспертыз Бабруйскага міжраённага аддзела ДКСЭ Марыне Грaзневай.** Яе дзед Аркадзь Канстанцінавіч Шумілаў у якасці сувязнога дайшоў да Берліна. Расказваў унучцы, як мёрз з таварышамі ў акопах, як пасля бою рабілі пераклічку і смуткавалі па загінулых таварышах, як плакалі і цалавалі лісты ад родных. Аркадзь Канстанцінавіч вярнуўся з вайны з ордэнам Айчыннай вайны II ступені і іншымі ўзнагародамі.

— Як высветлілася, яшчэ шмат у каго з нашых супрацоўнікаў ёсць што расказаць пра сваіх гераічных дзядоў і прадзедаў. І мы абавязкова працягнем гэты праект, — кажа Ірына Рачкоўская. — Магчыма, яго фармат крыху зменіцца, але мы павінны захоўваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Гэта той матэрыял, які яскрава сведчыць пра гераізм нашага народа. Важна, што гэтыя героі вайны — не нейкія невядомыя нам асобы, а жыхары або ўраджэнцы нашай вобласці, нашы дзядулі і бабулі. Яны набліжалі Перамогу, а цяпер іх унукі сталі афіцэрамі і працуюць на карысць сваёй Радзімы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту строительства «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича—Чижевских—Корзюки». Жилой дом № 4 по генплану**

**Информация о застройщике:**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» 220030, г. Минск, ул. К. Маркса,13а; режим работы: пн-чт – с 8.30 до 17.45, пт – с 8.30 до 16.30, перерыв 13.00–14.00; тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков строительства:**

- жилой дом № 60 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июль 2017 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 58 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2018 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 56 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: ноябрь 2017 г. – март 2019 г.;
- жилой дом № 70 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июнь 2018 г. – сентябрь 2019 г.;
- жилой дом № 68 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: сентябрь 2018 г. – октябрь 2019 г.;
- жилой дом № 72 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2019 г. – декабрь 2019 г.

**Информация об объекте строительства:**

ГПО «Минскстрой» осуществляет строительство объекта **«Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича—Чижевских—Корзюки». Жилой дом № 4 по генплану.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Начало строительства – 22 апреля 2020 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 5 февраля 2021 года.

**Результат государственной экспертизы проектной документации:**

Положительное экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 24.02.2020 №36-15/20.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**

г. Минск, территория в границах улиц Уборевича—Чижевских—Корзюки.

**Характеристика объекта строительства:**

Проектом предусмотрено строительство трехсекционного 9-этажного 105-квартирного жилого дома в конструкциях серии М464-У1, с техническим подпольем, теплым чердаком и плоской рулонной кровлей с организованным внутренним водостоком, встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже здания. Во всех квартирах предусмотрена полная планировка, организованы жилые комнаты, кухни, прихожие, санузлы, летние помещения. В квартирах на 1-м этаже под лоджиями предусмотрены погреба с доступом через люки по металлическим лестницам. Чистовая отделка квартир предусматривает окраску акриловыми красками потолков и стен в санузлах; оклейку обоями в жилых комнатах, коридорах, прихожих, кухнях, кладовых. Полы в жилых комнатах, коридорах, прихожих, кладовых, кухнях квартир – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове; в санузлах – керамическая плитка. Наружные стены здания запроектированы из трехслойных сборных железобетонных панелей с энергоэффективным утеплителем; внутренние стены – из сборных железобетонных панелей. Окна: деревянный профиль, заполнение – двухкамерные стеклопакеты. Устройство мусоропровода проектом не предусмотрено.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**

Предлагается 105 объектов долевого строительства для заключения договоров.

**Цены на объекты долевого строительства**

Ориентировочная стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 243,98 белорусского рубля (для нормируемой площади жилого помещения);

1 980,00 белорусского рубля (для площади жилого помещения, превышающей нормируемую).

**Условия оплаты:**

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 30 % от стоимости объекта долевого строительства, оплата должна быть произведена в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

В соответствии с решениями Мингорисполкома от 07.03.2019 № 667 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2019 году, по строительству жилых домов для многодетных семей», от 14.11.2019 № 3526 «Об изъятии, предоставлении, прекращении существования земельных участков и разрешении строительства» и от 16.04.2020 № 1179 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2020 году» договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться **с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска**.

**Права застройщика на земельный участок:**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-9990 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него 10 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 0,3232 га.

Свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3120 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него 24 апреля 2018 года. Земельный участок площадью 6,3137 га.

**Количество в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома:** общее количество квартир – 105 шт., в т. ч. однокомнатных – 16 шт., двухкомнатных – 52 шт., трехкомнатных – 28 шт., четырехкомнатных – 9 шт.

**Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, а также элементы озеленения и благоустройства.

**Сведения о договоре строительного подряда, заключенного с застройщиком:** договор строительного подряда от 16.04.2020 № 260с-04-20, генподрядчик – ООО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства и ходом работ по нему:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Заместитель генерального директора Д. В. Гуриненко

---

## 19.06.2020 года в 11.00 Светлогорский районный исполнительный комитет проводит открытый аукцион по продаже незавершенного строительством жилого дома и права заключения договора аренды земельного участка Аукцион состоится в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1, 2-й этаж

| № лота | Наименование лота | Назначение участка | Начальная цена | Сумма задатка |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенный строительством незаконсервированный жилой дом с инвентарным номером 342/U-47164, готовностью 7 %, сарай газосиликатный, гараж бетонный, летняя кухня кирпичная, погреб, уборная, беседка, ворота, калитка, ограждения, расположенные по адресу: Гомельская область, Светлогорский район, г. Светлогорск, ул. Березинская, д. 32, на земельном участке с кадастровым номером 325050100001000321 площадью 0,0987 га и с правом заключения договора аренды этого земельного участка сроком на 50 лет | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | 24257 руб. 52 коп. (в том числе 21324,02 руб. – нач. цена незавершенного строительством жилого дома, 2737,13 руб. – нач. цена права заключения договора аренды, 196,37 руб. – расходы на оценку) | 2425 руб. 75 коп. |

Условия продажи: победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обязан:

1) возместить бывшему собственнику 88,62 % от суммы, полученной от продажи предмета аукциона, за вычетом расходов на оценку не завершенного строительством жилого дома;

2) внести плату (часть платы в случае предоставления Светлогорским районным исполнительным комитетом рассрочки ее внесения в установленном порядке) за право заключения договора аренды земельного участка путем перечисления средств на бюджетный счет районного финансового отдела

№ BY55AKBB36004290000160000000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400555165, наименование платежа — 04002, за вычетом суммы, подлежащей возмещению бывшему собственнику;

3) возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнить иные обязательства, указанные в протоколе аукционных торгов; после совершения указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить со Светлогорским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;

4) в течение 2 месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка и получения решения Светлогорского районного исполнительного комитета от 28 февраля 2020 г. № 397 обратиться в Светлогорское бюро Речицкого филиала республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией возникновения прав, ограничений (обременений) права на земельный участок. При невыполнении данного требования, вышеуказанное решение считается утратившим силу; заключить со Светлогорским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;

5) получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома в срок, не превышающий одного года со дня государственной регистрации возникновения прав, ограничений (обременений) права на земельный участок;

6) юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю — в течение шести месяцев, а гражданину — в течение одного года со дня утверждения, в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

7) завершить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные частью второй пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 87.

К участию в аукционе допускается: гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя), подавшее заявление на участие в аукционе и заключившее соглашение со Светлогорским райисполкомом, с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение задатка, с отметкой банка. Задаток перечислятся на расчетный счет райисполкома № BY27AKBB36044290020443200000 в ЦБУ № 322 филиала № 312 ОАО «АСБ «Беларусбанк», BIC AKBBBY21312, УНП 400019707, Светлогорский райисполком; назначение платежа – задаток на аукцион. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона;

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

**Документы для участия в торгах принимаются** по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, каб. 31, отдел экономики райисполкома с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с даты опубликования извещения **до 16.06.2020 включительно.** Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 11.00 по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1, каб. 31 (3 этаж, правое крыло). Телефон: 8 (02342) 90839, 72065.

**Условия проведения аукциона** – наличие не менее двух участников, при наличии одного участника предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Порядок осмотра на местности земельных участков:** выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всеми желающими.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

---

БЕЛАРУСБАНК

## Публичная оферта (предложение) на изменение порядка уменьшения ставки дохода по вкладу в связи с изменением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 8 % годовых

